Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 САКАВІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 46
(26404)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ЗАЎТРА ТОЛЬКІ Ў «ЗВЯЗДЗЕ»!

«ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ» — спецвыпуск «Чырвонай змены», прысвечаны ўступнай кампаніі-2009.

Дзе і як правільна і хутка прайсці тэсціраванне, якія змяненні ў правілах паступлення ў ВНУ Беларусі, якія новыя спецыяльнасці прапаноўваюць нашы навучальныя ўстановы. Пра гэта і многае іншае вы даведаецеся, калі прачытаеце чарговы нумар газеты!

Аляксандр Лукашэнка і Серж Саргсян правялі кароткую сустрэчу ў фармаце сам-насам

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 11 сакавіка накіраваўся з рабочым візітам у Рэспубліку Арменія. Дамоўленасць аб гэтым была дасягнута ў ходзе нядаўняй тэлефоннай размовы лідараў дзвюх краін.

Праграмай візіту прадугледжаны сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з кіраўніцтвам Арменіі, прадстаўнікамі дзелавых колаў. На перагаворах у цэнтры ўвагі будуць знаходзіцца актуальныя пытанні двухбаковых адносінаў, перш за ўсё развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з улікам уплыву сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, а таксама пытанні ўзаемадзеяння краін у рамках інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы.

Асаблівую ўвагу плануецца ўдзяліць умацаванню міжрэгіянальных сувязяў, супрацоўніцтву ў энергетычнай сферы, удзелу Беларусі ў рэалізацыі некаторых дзяржаўных праграм па развіцці эканомікі Арменіі, наладжванні прамысловай кааперацыі, развіцці турызму і культурных сувязяў паміж двума народамі. Узаемны тавараабарот Беларусі і Арменіі ў мінулым годзе павялічыўся ў параўнанні з 2007 годам на 18,9 працэнта і склаў $28,2 млн, што зусім не адпавядае эканамічным патэнцыялам дзвюх краін.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў учора з рабочым візітам у Рэспубліку Арменія. У аэрапорце Ерэвана «Звартноц» кіраўніка беларускай дзяржавы сустракаў яго армянскі калега Серж Саргсян. Прэзідэнты правялі кароткую сустрэчу ў фармаце сам-насам.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Пётр ПРАКАПОВІЧ:

Рэзкай дэвальвацыі нацыянальнай валюты ў Беларусі не будзе

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч нагадаў, што ў пачатку года ў Беларусі была праведзена разавая дэвальвацыя. Больш дэвальвацыі за адзін раз у нас не будзе.

Такім чынам, у насельніцтва цяпер няма падстаў скупляць валюту, тым больш што стабільнасць нацыянальных валют развітых краін сёння непрадказальная. Як паведамлялася, з 2009 года Нацбанк пачаў ажыццяўляць прывязку беларускага рубля да карзіны з трох валют — долар ЗША, еўра, расійскі рубель. На 2 студзеня курс нацыянальнай валюты да карзіны валют устаноўлены на ўзроўні Br960 пасля 20-працэнтнай аднамомантнай дэвальвацыі беларускага рубля.

Пётр Пракаповіч запэўніў, што Нацыянальны банк у 2009 годзе ў любой сітуацыі забяспечыць курс беларускага рубля да карзіны валют у межах +/-5 працэнтаў. Паводле даных на 12 сакавіка курс беларускага рубля адносна карзіны замежных валют з пачатку года ўмацаваўся на 0,9 працэнта і з заўтрашняга дня ўстаноўлены на ўзроўні Br951,4. Гэта змяненне знаходзіцца ў межах 5-працэнтнага калідора вагання ў.

Нацбанк Беларусі і Народны банк Кітая падпісалі пагадненне аб валютным свопе. У рамках заключанага ўчора пагаднення будзе прадастаўлена 20 млрд рэнмінбі і Br8 трлн (прыкладна $2,8 млрд). Тэрмін дзеяння пагаднення складае 3 гады і можа быць прадоўжаны па ўзаемнай згодзе бакоў. Як растлумачылі ў Нацбанку, атрыманая валюта будзе трымацца на дэпазіце і будзе залічана ў склад золатавалютных рэзерваў Беларусі ў нацыянальным выражэнні.

БЕЛТА.

ГАЛОЎНАЕ — ЗАМЕЖНЫ РЫНАК

Антыкрызісная эканоміка

Цяжкае машынабудаванне традыцыйна лічыцца адной з «візітак» эканомікі Беларусі, прычым не сакрэт: значная частка прадукцыі галіны заўсёды ішла на экспарт. Між тым, як паўплывала падобная акалічнасць на стан айчынных прадпрыемстваў цяжкага машынабудавання, наколькі актуальная для іх праблема няпоўнай занятасці і якая верагоднасць таго, што ў работнікаў галіны будуць змяншацца гарантыі па калектыўных дагаворах? Пра гэта — наша гутарка са старшынёй Беларускага прафсаюза металістаў Іванам КАЛЕСНІКАМ.

— Нестабільнасць на знешніх рынках — факт вядомы. Як гэта адбіваецца на галіне?

— Самым непасрэдным чынам. Прадпрыемствы галіны «завязаныя» на знешніх рынках як у плане атрымання сыравіны, так і рэалізацыі прадукцыі. Пры гэтым замарожванне многіх будаўнічых праектаў у Расіі і ва Украіне прывяло да рэзкага скарачэння заказаў, і ў тым ліку гэта адчулі нашы лідары — адзін з найбуйнейшых у Еўропе вытворцаў дарожнай тэхнікі ААТ «Амкадор» і завод «Магілёўліфтмаш». Адпаведна, мы вымушаны канстатаваць зніжэнне аб'ёмаў продажаў, аб'ёмаў вытворчасці — як вынік, сталі ўзнікаць праблемы з абаротнымі сродкамі і зменшыліся заробкі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ганна і Аляксандр ШОКЕЛІ не проста маладая сям'я — працоўна-студэнцкая. Ганна заканчвае Віцебскі політэхнічны тэхнікум, будучы праграміст. Аляксандр — завочнік Гарадоцкага сельскагаспадарчага каледжа, набывае прафесію механіка. Таму яны частыя наведвальнікі чытальнай залы раённай бібліятэкі ў Міёрах.

Пётр МІКЛАШЭВІЧ:

Пакаранне смерцю ў Беларусі мае выключны характар

Прымяненне смяротнай кары ў Беларусі адбываецца толькі ў выключных выпадках, як гэтага патрабуе заканадаўства. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі Пётр Міклашэвіч.

«З вопыту сваёй работы ў Вярхоўным судзе і Генеральнай пракуратуры магу пацвердзіць: калі 10 гадоў таму выносілася да 50 смяротных прыгавораў у год, то цяпер толькі 2-3 у год», — сказаў старшыня Канстытуцыйнага суда.

«Ёсць розныя пункты погляду адносна таго, ці выконвае пакаранне смерцю стрымальную функцыю ў працэсе барацьбы са злачыннасцю. Зыходзячы з займаемай пасады, я ў гэтым пытанні ўстрымаюся ад ацэнкі», — сказаў ён.

На рэспубліканскім рэферэндуме 1996 года больш як 80 працэнтаў тых, хто прагаласаваў, выказаліся за захаванне смяротнай кары.

Канстытуцыйны Суд Беларусі не выявіў супярэчнасцяў Асноўнаму закону ні ў адным з вывучаных ім законапраектаў. Паводле слоў Пятра Міклашэвіча, з таго часу, калі Канстытуцыйнаму Суду было прадастаўлена паўнамоцтва канстытуцыйнага кантролю ўсіх законапраектаў, прынятых парламентам, да падпісання іх Прэзідэнтам, былі вывучаны 102 законапраекты, у тым ліку 3 кодэксы і 40 праектаў законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у нарматыўна-прававыя акты. Адсутнасць парушэнняў Асноўнага закона ў прымаемых законапраектах Пётр Міклашэвіч адносіць на рахунак прафесійнай работы парламента, добрай узгодненасці работы органаў дзяржаўнага кіравання пры падрыхтоўцы законапраектаў. Старшыня КС таксама паведаміў, што за 15 гадоў існавання Канстытуцыйнага Суда ў Беларусі ім было вынесена больш як 400 рашэнняў практычна ва ўсіх сферах права.

БЕЛТА.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество
«Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 18 МАРТА 2009 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об утверждении изменений в Устав ОАО «Белагропромбанк».
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 10 марта 2009 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк».

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 16 марта 2009 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 27 марта 2009 года.

Телефоны для справок:
8(017) 250 60 01, 228 53 00.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (Life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АДСТУПЛЕННЕ ХВАЛІ ПРАСТУДНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ ЗАМАРУДЗІЛАСЯ?

Сырое і вільготнае надвор'е нават з плюсавой тэмпературай, якое ўсталявалася ў апошнія дні, зусім не паскарае спад захваральнасці насельніцтва на грып і ВРВІ. Так, з 2 па 8 сакавіка ў кантрольных гарадах Беларусі на прастуду і грып захварэлі 83 392 чалавекі, што ўсяго на 2,3 % менш за паказчык папярэдняга тыдня. Сярод выдзеленых вірусаў пераважаюць адэнавірусы (47,3 %) і вірусы грыпу А (18,9 %). Супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы па-ранейшаму ажыццяўляюцца ў Мінску, Барысаве, Бабруйску, Салігорску, Наваполацку, Баранавічах, Магілёве, Віцебску, Оршы і 30 раёнах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЦЭНЫ НА ЦЫГАРЭТЫ ЎЗРАСЛІ НА 10 %

Сёлета ў другі раз павышаны рознічныя цэны на цыгарэты ў сярэднім на 10 %. Нагадаем, што папярэдні рост на тытунёвую прадукцыю адбыўся напрыканцы студзеня, калі яе кошт у сярэднім вырас таксама на 10 %.

Павышэнне цэнаў на цыгарэты з 11 сакавіка прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі №40. У сярэднім на 10 % узнятыя рознічныя цэны на цыгарэты, якія імпартуюцца ў рэспубліку, на цыгарэты, што вырабляюцца ў нашай краіне па праграме імпартазамяшчэння, а таксама на некаторыя маркі цыгарэт, што вырабляюцца ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман». У міністэрстве адзначылі, што цэны павышаны для кампенсацыі падаражання затрат на тытунёвую прадукцыю за кошт павелічэння акцызу, кошту сыравіны і матэрыялаў, мытнага кошту цыгарэт, што ўвозяцца.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЕСНАВОЕ ПАЛЯВАННЕ НА ПТУШКУ

Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, з другой суботы сакавіка, якая сёлета прыпадае на 14 дзень месяца, у краіне распачнецца чарговы веснавы сезон палявання на гусей — белалобую, гуменніка і шэрую, паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі.

Паляваць на птушак будзе дазволена па другую нядзелю мая ў светлы час сутак. Дазваляецца ружэйны спосаб палявання з засады, з завабліваннем, у тым ліку з падсаднымі гусянымі, профілямі. Да 14 сакавіка дазволена толькі здабыча дзікіх жывёл непажаданых відаў у вызначаным названымі Правіламі парадку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АДКАЗНАЯ АСОБА «СПАЛІЛАСЯ» НА $30 000

У Бабруйску затрымана адказная асоба, якая падазраецца ў хабарніцтве.

Як паведаміла аперупаўнаважаны па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Вераніка Пасмецьева, у Бабруйску супрацоўнікі па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі УУС Магілёўскага аблвыканкама і Бабруйскага ГУУС у службовым кабінеце за атрыманне хабару затрымалі адказную асобу мясцовай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Як мяркуецца, гэты падазроны атрымаў 30 тысяч долараў ЗША хабару за тое, што на карысць мясцовага індывідуальнага прадпрымальніка даў загад некалькім будаўнічым арганізацыям вывезці грунт і будаўнічыя адыходы для засыпкі катлавана на яго аб'екце, які будуецца.

Ігар ГРЫШЫН.

ЧЫНОЎНІКА ЗЛАВІЛІ ЗА РУКУ

У дачыненні да намесніка кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста ўзбуджана крымінальная справа. Яго затрымалі непасрэдна на працоўным месцы ў момант атрымання хабару ад прадпрымальніка. У праваахоўнікаў ёсць інфармацыя пра неаднаразовыя факты такога кшталту. Расследаваннем займаецца пракуратура. Усе эпізоды абвінавачвання давядзецца даказваць у вызначаным законам парадку.

Яна СВЕТАВА, Ігар ГРЫШЫН.

УВАГА — ФАЛЬШЫЎКІ!

Пяцітысячныя фальшывыя купюры тройчы за апошнія дні знойдзены ў Гомелі. Цікава, што вызначыць іх несапраўднасць змаглі толькі эксперты пасля таго, як выручка з прадпрыемстваў гандлю трапіла ў розныя банкі абласнога цэнтра. Пакуль вядома толькі тое, што ўсе купюры датуюцца 2000 годам выпуску і выраблены спосабам кропельна-струменнага друку не на прадпрыемстве, якое ажыццяўляе вытворчасць каштоўных папер Рэспублікі Беларусь.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КРЫМІНАЛЬНІК ПАДПАЛІЎ КВАТЭРУ АХВЯРЫ

У Лідзе пры тушэнні пажару ў кватэры 71-гадовай пенсіянеркі было знойдзена цела гаспадыні: рукі жанчыны былі звязаныя.

Судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла, што прычынай смерці пенсіянеркі стала механічная асфіксія. Праваахоўнікі затрымалі 20-гадовага мужчыну. Як мяркуецца, ён пранік у кватэру загінулай пад выдуманай прычынай: маўляў, хацеў купіць халадзільнік. А калі апынуўся ў жыллі, звязаў гаспадыню і завалодаў яе грашыма. Здабычай злачынца сталі 200 тысяч рублёў, 650 долараў ЗША і 35 еўра. Пенсіянерку ён задушыў, пасля падпаліў кватэру. У падзронага канфіскавана частка выкрадзенага.

Ігар ГРЫШЫН.

НОВЫ ЧАС НАРОДНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

На думку Сяргея Маскевіча, парламентарыі павінны працаваць на тое, каб еўрапейскія калегі ўсвядомілі, што Беларусь — гэта еўрапейская суседка, узаемадзеянне з якой адпавядае інтарэсам самой Еўропы.

Еўрапейскі вектар у знешніх адносінах Беларусі праступае апошнім часам усё больш выразна. Узяць хоць бы нядаўнія візіты прадстаўнічых еўрапейскіх дэлегацый. Палітыкі і эксперты праводзяць у Беларусі сустрэчы і кансультацыі. Сумесная праца ідзе, у прыватнасці, па змяненні выбарчага заканадаўства краіны. Так што актывізацыя адносінаў у наяўнасці, можна нават казаць пра адлігу на заходнім кірунку. А вось як гэта адаб'ецца на рабоце народных абраннікаў, якой бачаць еўраперспектыву ў парламенце? Высвятляем у **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргея МАСКЕВІЧА:**

— Сёння відавочны пералом да лепшага ў нашых адносінах з Еўрасаюзам. Летась у Мінску адкрылася прадстаўніцтва Еўракамісіі, узраслі інтэнсіўнасць і ўзровень нашых палітычных кантактаў па гэтым кірунку. Знакавымі падзеямі можна назваць візіты дэлегацый ПАСЕ (на чале са старшынёй камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях Ёранам Ліндбладам), Еўрасаюза (на чале з Генеральным сакратаром Савета Еўрапейскага саюза — Вярхоўным прадстаўніком па пытаннях агульнай знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі ЕС Хаўерам Саланам), ПА АБСЕ (пад кіраўніцтвам старшыні асамблеі Жаау Сааараша). Беларусь і Еўрасаюз знаходзяцца ў пачатку шляху па выбудоўванні доўгатэрміновага супрацоўніцтва, нас чакае карпатлівая праца па дасягненні максімальна канкрэтных дамоўленасцяў, якія б дазволілі істотна прасунуць узаемадзеянне.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Ёсць нагода

НЯМА АПОВЕСЦІ СУМНЕЙШАЕ НА СВЕЦЕ...

Напэўна цяжка адшукаць чалавека, які не ведаў бы гэту фразу. Аднак мала хто ведае, што паводле адной з самых знакамітых трагедый Шэкспіра 11 сакавіка ў Вероне адбылося таемнае вянчанне Рамэо і Джульеты — дзяцей з кланаў Капулеці і Мантэкі, якія варагавалі паміж сабой не адно стагоддзе. Прычым на дзень 11 сакавіка празрыста намякнуў сам Шэкспір, а год — 1302 — вылічылі пазней даследчыкі яго творчасці.

Зрэшты, калі быць дакладным, то дату назваў італьянскі шляхціч Луіджы да Порта ў сваёй «Гісторыі пра дваіх высакародных закаханых», якая легла ў аснову шэкспіраўскай п'есы. Менавіта да 11 сакавіка праз 528 гадоў пасля гіпатэтычнай падзеі была прымеркавана прэм'ера оперы Вінчэнца Беліні — «Капулеці і Мантэкі», якая з трыумфам прайшла ў Венецыі. Праўда, створаная яна была не паводле Шэкспіра, а паводле творчасці мноства італьянскіх аўтараў (нават у «Боскай камедыі» Дантэ ўзгадваюцца прозвішчы Мантэкі і Капулеці).

Ці існавалі насамрэч юныя закаханыя, гісторыя якіх не першае стагоддзе кранае сэрцы людзей, дагэтуль дакладна не вядома. У Вероне ў XIII стагоддзі жылі сем'і з падобнымі прозвішчамі — дэль Капела і Мантыколі; але ў якіх яны былі стасунках, навукоўцам высветліць не ўдалося — цалкам можа быць, што і варагавалі.

Вікторыя ЗАХАРАВА.



Кадр з фільма Франка Дзефірэлі «Рамэо і Джульета» 1968 г.; магільня Джульеты ў Вероне.

ПЕНСІЯНЕР НІЧЫМ НЕ ГОРШЫ

Твае правы

Брытанскі сотавы аператар Vodafone, аўтаканцэрны Volvo, Volkswagen, КАМАЗ і ГАЗ, група «Нарыльскі нікель», шэраг буйных еўрапейскіх банкаў. За апошні час іх аб'ядналае адно — масавыя звальненні персаналу пад уплывам эканамічнага крызісу. Сітуацыя ў Беларусі выглядае крыху інакш. На сёння службы занятасці маюць інфармацыю аб магчымых скарачэннях на працягу I квартала прыкладна 3,6 тыс. чалавек, прычым цяперашняя лічба меншая, чым за студзень—сакавік летась. Разам з тым, таксама не сакрэт: сёння гэта тэма застаецца на слыху. Між тым, як і на якіх умовах можа адбыцца скарачэнне, хто павінен трапляць пад яго ў апошнюю чаргу і што рабіць, калі «датэрміновае развітанне» ўсё ж адбылося? Каб адказаць на гэтыя пытанні, карэспандэнт «Звязды» вырашыў сустрэцца з загадчыкам юрыдычнай кансультацыяй галоўнага прававога ўпраўлення апарата Савета Федэрацыі прафсаюзаў Уладзімірам Іванавічам ШЭЛКОВІЧАМ.

«Уласнае жаданне». Мінус дапамога

У выпадку, калі наймальнік прыходзіць да высновы, што ранейшая колькасць работнікаў яму ўжо не патрэбна, звычайна выбіраецца шлях... непрацэсу кантрактаў пасля заканчэння тэрміну іх дзеяння. Або супрацоўніка проста просяць звольніцца. Пры гэтым не сакрэт, што на развітанне «па ўласным жаданні» або па пагадненні бакоў ідуць сапраўды многія. Аднак ці варта гэта рабіць — пытанне ўжо іншае. Прынамсі, работнік, што піша падобную заяву, проста сыходзіць. У той час як работнік, які патрапіў пад скарачэнне, пакідае арганізацыю з выхадной дапамогай — у памеры як мінімум 3 сярэдніх заробкаў. Да слова, памер падобнай кампенсацыі можа быць і большым — у выпадку, калі гэта прадугледжвае калектыўны дагавор арганізацыі.

У заканадаўстве няма патрабавання — абавязкова «пазбаўляцца» ад работнікаў-пенсіянераў.

«Трымаць» месцы нельга

Па вялікім рахунку, арганізацыя, якая апынулася ў складаным становішчы, пайсці на скарачэнне персаналу можа. Аднак тут існуюць пэўныя правілы.

Так, па-першае, работніку павінны паведаміць аб мяркуемым скарачэнні не пазней чым за два месяцы. Аднак па прапанове наймальніка тэрмін абавязковага папярэджання можна замяніць грашовымі выплатамі.

Другі ж і не менш важны нюанс наступны. Заканадаўства вызначае, што на працягу тэрміну папярэджання наймальнік павінен зрабіць усё, каб перавесці работніка на іншае месца. Праўда, зусім не абавязкова на больш высокую пасаду і з больш высокай зарплатай.

— Падчас скарачэння павінны быць прапанаваныя ўсе без выключэння месцы, якія можа займаць работнік, і да таго ж не толькі ў арганізацыі, але і ў яе філіялах, — кажа Уладзімір Шэлковіч. — Прычым калі кіраўніку юрыдычнага аддзела не прапануюць вакансію дворніка ці прыбіральшчыка, звальненне можа быць прызнанае незаконным — з далейшым аднаўленнем на ранейшым месцы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калі падчас скарачэння кіраўніку юрыдычнага аддзела не прапануюць вакансію дворніка ці прыбіральшчыка, звальненне можа быць прызнанае незаконным — з далейшым аднаўленнем на ранейшым месцы.

Хто мае перавагі?

Падчас скарачэння пераважнае права застацца на ранейшых месцах маюць работнікі з больш высокай вытворчасцю працы і кваліфікацыяй. Ацэнкі ў гэтым выпадку робіць наймальнік. Разам з тым, падобныя ацэнкі можна аспрэчыць — скажам, у выпадку, калі звальняецца работнік, які выконвае больш прадукцыі, або работнік з больш высокім узроўнем адукацыі.

— Апроч таго, заканадаўства вызначае, каму павінна аддавацца перавага пры роўнай вытворчасці працы і кваліфікацыі, — зазначае Уладзімір Шэлковіч. — У прыватнасці, прыярытэт тут маюць асобы, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, грамадзяне, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС у 1986—1989 гадах у зоне эвакуацыі або ў 1986—1987 гадах у зонах першачарговага і наступнага адсялення ў, інваліды, цяжарныя жанчыны, жанчыны з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў, адзінокія маці з дзецьмі ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў, дзецьмі-інвалідамі ва ўзросце да 18 гадоў, работнікі-члены камісіі па працоўных спрэчках. Трэба мець на ўвазе, што работнік ва ўзросце да 18 гадоў можа патрапіць пад скарачэнне толькі са згоды раённай камісіі па справах няпоўнагадовых. І яшчэ. Своеасаблівы «імунітэт» маюць катэгорыі, вызначаныя ў калектыўным дагаворы. Калі ў калдагаворы будзе адзначана, што перавагамі застацца на ранейшым месцы карыстаюцца работнікі з сем'яў, якія маюць аднаго карміцеля, сем'яў з няпоўнагадовымі дзецьмі ці сем'і з інвалідамі, то для канкрэтнай арганізацыі гэта закон.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

БІЗНЭС З ЕЎРАПЕЙСКІМ РАЗМАХАМ

Інвестыцыйная прывабнасць Беларусі абмяркоўваецца на міжнародным узроўні

Бізнэсмены, эксперты, палітыкі з розных краін Еўропы абмеркавалі ўчора інвестыцыйны клімат Беларусі ва ўсіх яго аспектах. Маштабны, цікавы і насычаны семінар арганізаваны рабочай групай ПА АБСЕ па Беларусі сумесна з дэлегацыяй Нацыянальнага сходу ў парламенцкай асамблеі пры падтрымцы фонду імя Фрыдрыха Эберта. Прадметам дыскусій зацікаўленых асобаў стала стымуляцыя малога і сярэдняга бізнэсу ў рэгіёнах, стан і перспектывы інвестыцыйных умоў у нашай краіне, супрацоўніцтва ў гэтай сферы з дзяржавамі ЕС. Парламентарыі распавялі гасцям пра наяўную заканадаўчую базу, прадстаўнікі замежных кампаній, якія паспяхова рэалізавалі інвестыцыйныя праекты ў Беларусі, падзяліліся сваім вопытам, прадстаўнікі недзяржаўных аб'яднанняў прадпрымальнікаў выказалі свае прапановы. У прыватнасці, актыўна дыскутавалася неабходнасць у законе аб малым і сярэднім прадпрымальніцтве. Адказваючы на пытанні журналістаў, **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый ІВАНОЎ** запэўніў, што адпаведны законапраект знаходзіцца ў стадыі прапрацоўкі з улікам сітуацыі фінансавага крызісу, работа ў камісіях вядзецца. Віцэ-спікер падкрэсліў, што агучаныя на семінары прапановы па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату краіны будуць улічаныя.

Па танальнасці гутаркі дэлегатаў ПА АБСЕ з журналістамі адчувалася, што семінар яны распачынаюць з аптымістычным настроем. **Старшыня ПА АБСЕ Жаау СААРАШ** адзначыў, што «яшчэ вельмі вялікі шлях наперадзе, яшчэ шмат трэба зрабіць», пры гэтым прызнаў: «Сам факт, што рух наперад пачаўся, пазітыўны». Паводле яго слоў, «пазіцыя АБСЕ, у адрозненне ад пазіцыі Еўрасаюза, мабыць, у некаторых аспектах, заключаецца ў тым, што Беларусь ні ў якім разе не павінна быць ізаляваная».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.03.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 880,00
▼ 1 еўра	3 645,79
1 латвійскі лат	5 153,90
1 літоўскі літ	1 055,78
1 чэшская крона	135,91
1 польскі злоты	789,14
▲ 1 расійскі рубель	82,01
1 украінская грыўня	366,88

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	35,1164
10 UAH	44,7343
1000 BYR	12,1890
EUR	44,4258

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ГАЛОЎНАЕ — ЗАМЕЖНЫ РЫНАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ці зменіўся рэжым работы прадпрыемстваў?

— Найбольш складаная аказалася сітуацыя на двух з 24 прадпрыемстваў галіны. Паводле нашай інфармацыі, ААТ «Бабруйскі машынабудаўнічы завод» у сакавіку працуе па чатырохдзённы — з аплатай пятага дня ў памеры 2/3 тарыфнай стаўкі. Сур'ёзныя праблемы (якія, дзеля справядлівасці, з'явіліся яшчэ да цяперашняга крызісу) існуюць і на ваўкавыскім заводзе дахавых і будаўніча-апрацоўчых машын. Магчыма, у хуткім часе на чатырохдзённу пойдзе і гэта прадпрыемства. Што да астатніх заводаў, то пакуль іх работа большменш стабільная. Праўда, мы маем звесткі, што дзе-нідзе ў перыяды рэзкага змяншэння аб'ёмаў вытворчасці работнікі пісалі заявы на некалькі дзён водпуску «за свой кошт».

— Адзін з варыянтаў паводзінаў у цяжкай сітуацыі — эканомія. І ў тым ліку на сацыяльных гарантыях. Ці адбылося іх змяншэнне?

— Трэба зыходзіць з таго, што самае галоўнае на сёння — захаваць працоўныя месцы. Весці гаворку аб масавых скарачэннях не выпадае, але пытанні тут ёсць. Не сакрэт, што апошнім часам на асобных прадпрыемствах робяцца спробы «пазбаўляцца» ад работнікаў у пенсійным узросце, проста не працягваць з такімі работнікамі кантракты. Мы як прафсаюз выступаем супраць. Бо зразумела, што пры такіх падыходах ёсць рызыка страціць найбольш вопытных і кваліфікаваны персанал. Задачай жа нумар два мы лічым менавіта захаванне сацыяльных гарантый работнікам. Безумоўна, зрабіць гэта цяжка, выпадкі, калі прымаліся рашэнні аб замарожванні асобных пунктаў калектыўных дагавораў ёсць — скажам, завод «Магілёўліфтмаш» адмовіўся ад аказання дапамогі работнікам, якія будуюць ці набываюць жыллё, зменшыў выплаты з нагоды нараджэння дзяцей і пахаванняў. Разам з тым асноўныя пазіцыі калдагавора на заводзе не змянілася. Як, да слова, не адбылося значных змен і на іншых прадпрыемствах.

— Асноўнае пытанне — што далей?

— Вельмі добра, што за апошні час былі прынятыя два рашэнні. Па-першае, наконт дазволу прадаваць частку прадукцыі танней за сабекошт, што ў значнай ступені «згладзіла» праблему з абаротнымі сродкамі. І, па-другое, прыйшліся дарэчы пазыкі прадпрыемствам на набыццё сыравіны, перш-наперш металу. Дзякуючы гэтаму, заводы не сталі. Разам з тым спрагназаваць дакладна далейшае развіццё падзей пакуль цяжка — паўтаруся, у асноўным усё залежыць ад сітуацыі за межамі нашай краіны. Аднак на першы план сёння павінны выходзіць два моманты — пошук новых рынкаў і пераход на новыя віды прадукцыі. Прычым станоўчыя прыклады тут ужо ёсць. Скажам, магілёўскі завод «Страммашына», апроч «асноўнага» абсталявання для цагляных заводаў і заводаў па вытворчасці шыферу, асвоіў пад'ёмныя краны — у выніку тут не адчуваецца праблем з заказамі і работай. Тое ж можна сказаць і аб заводзе «Брэстмаш», дзе робяць стаўку на абсталяванне для малочнай і мясной перапрацоўкі.

Сяргей ГРЫБ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ГЕРМАНІІ ЭКС-ВУЧАНЬ УЧЫНІЎ БОЙНЮ Ў ШКОЛЕ: 16 ЗАГІНУЛЫХ

Узброены малады чалавек, апрануты ў камуфляж, уварваўся ў адну са школ на поўдні Германіі і адкрыў агонь. У выніку стральбы ў каледжы і побач загінулі дванаццаць чалавек. Яшчэ траіх злачынец забіў пазней, пасля чаго загінуў у перастрэлцы з паліцыяй.

Трагедыя адбылася ў каледжы горада Вінендэн. Прыкладна ў 9:30 у вучэбную ўстанову пракраўся 17-гадовы юнак з аўтаматычнай зброяй і ў чорнай форме ваеннага ўзору. Ім быў былы навучэнец гэтай установы, імя якога не называецца. Пасля бойні злачынец быў застрэлены паліцыяй. Падчас перастрэлак таксама былі параненыя дзве супрацоўнікаў паліцыі і забітыя два выпадковыя прахожыя. Перад тым, як забойцу абясшкодзіла паліцыя, ён узяў на вуліцы аднаго закладніка, якога потым адпусціў, не прычыніўшы яму шкоды. Раней паведамлялася аб штурме паліцыяй дома, у якім жывуць бацькі забойцы. Там паліцыя выявіла цэлы арсенал з 18 стволаў.

РАЗВЕДКА ЗША АСПРЭЧЫЛА ЗДОЛЬНАСЦЬ ІРАНА СТВАРЫЦЬ ЯДЗЕРНУЮ БОМБУ

Кіраўнікі амерыканскай разведкі заявілі Кангрэсу, што Іран не валодае высокаўзбагачаным уранам, неабходным для стварэння ядзернай боегалоўкі. З такой ацэнкай азнаёмілі заканадаўцаў дырэктар нацыянальнай разведкі Дэніс Блэр і кіраўнік разведвальнага упраўлення Пентагона Майкл Мейплз.

Словы Блэра і Мэйплза разыходзяцца з меркаваннем кіраўніка ізраільскай ваеннай разведкі Амоса Ядліна, які заявіў у выхадных, што Іран ужо атрымаў магчымасць стварыць ядзерную зброю. Блэр і Мэйплз лічаць, што іранцы валодаюць толькі нізкаўзбагачаным уранам і інфармацыяй аб яго ўзбагачэнні не валодаюць. Паводле адзнак амерыканскай выведкі, стварыць ядзерную бомбу Іран зможа толькі да 2010 года, а паводле меркавання некаторых аналітыкаў — яшчэ пазней, да 2015-га.

УКРАІНА: СТОП ІМПАРТУ КАМБАЙНАЎ

Урад Украіны ўвёў забарону на ўвоз замежнай прадукцыі сельскагаспадарчага машынабудавання, аналагі якой вырабляюцца ва Украіне, паведамляе proUA. Адпаведнае рашэнне прынята на пасяджэнні кабінета міністраў 11 сакавіка.

На гэтыя меры кабінет міністраў Украіны рашыўся пасля таго, як на мяжы закрыцця апынуўся шэраг прамысловых прадпрыемстваў краіны, у прыватнасці Херсонскі машынабудаўнічы завод, на якім вырабляюцца камбайны і іншая сельскагаспадарчая тэхніка. Рабочыя завода, якія апынуліся без працы і зарплаты, у лютым спачатку захапілі сам завод, а затым — будынак херсонскай абласной адміністрацыі.

У МАЛДОВЕ Ў ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЕ З'ЯВІЦЦА ШАХМАТЫ

У Малдове вывучэнне шахмат будзе ўключана ў школьную праграму. Такое рашэнне прыняў урад рэспублікі.

У пастанове ўрада адзначаецца, што шахматы з'яўляюцца адным з прыярытэтных кірункаў у развіцці нацыянальнага спорту. У школах іх будуць вывучаць у рамках дысцыпліны «Фізічнае выхаванне». Навучанне пачнецца ўжо з наступнага навучальнага года.

Андрэю Арамнаву пагражае крымінальная адказнасць

Алімпійскаму чэмпіёну па цяжкай атлетыцы Андрэю Арамнаву пагражае крымінальная адказнасць. 28 лютага спартсмен быў затрыманы ў Барысаве супрацоўнікамі ДАІ ў нецвярозым стане за рулём сваёй БМВ. Праходзіць медыцынскі агляд алімпійскі чэмпіён адмовіўся. Напярэдадні, 27 лютага, усе прызёры пекінскай Алімпіяды, у тым ліку і Арамнаў, атрымалі ў падарунак ад Нацыянальнага алімпійскага камітэта кватэры ў сталіцы.

Гэта не першы выпадак затрымання Арамнава даішнікамі. 7 снежня мінулага года цяжкаатлет таксама сеў за руль у нецвярозым стане, за што атрымаў штраф у 30 базавых велічынь (больш за мільён рублёў) і быў пазбаўлены правоў на тры гады. Аднак вадзіцельскае пасведчанне рэкардсмен Пекіна не здаў і менш чым праз тры месяцы быў затрыманы другі раз. Машына алімпійскага чэмпіёна была дастаўлена на штрафстаянку, а Андрэй пайшоў дадому пешшу.

За паўторнае кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане Арамнава чакае «штраф, ці папраўчыя работы тэрмінам да двух гадоў, ці арышт на тэрмін да шасці месяцаў», згодна з атрыкулам 317 Крымінальнага кодэкса.

Ад каментарыяў алімпійскі чэмпіён, які зараз знаходзіцца на зборах з камандай у Стайках пад Мінскам, адмаўляецца. Галоўны трэнер каманды па цяжкай атлетыцы Аляксандр Ганчароў праканментаваў учынак свайго падапечнага «БелГазете» наступным чынам: «Арамнаў — неардынарная асоба, заўсёды мае сваё меркаванне, вельмі часта няправільнае: напэўна, алімпійскі медаль прынёс поўную самаўпэўненасць, якая ідзе ў разрэз з тым, як трэба сябе паводзіць у грамадстве. Міністэрства і федэрацыя абавязкова прымуць рашэнне па гэтым пытанні, і пакаранне ён панясе». Пра сітуацыю з Арамнавым праінфармаваны міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў і міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў. Справа перададзена на разгляд кіраўніцтва спартыўнай каманды Унутраных войскаў МУС Беларусі, да якой належыць цяжкаатлет. Аддзел грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў і Упраўленне ДАІ МУС таксама пакуль адмаўляецца ад афіцыйных каментарыяў.

Алена КРАВЕЦ.

Уважаемые акционеры
ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин

ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин извещает акционеров о дополнении повестки дня очередного общего собрания акционеров, которое состоится 26 марта 2009 года в очной форме вопросом:

«10. О крупной сделке Общества».

УНП 200093330.

ПЕНСІЯНЕР НІЧЫМ НЕ ГОРШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Перадпенсійны ўзрост гарантый не дае

Адметны нюанс. Ніякіх дадатковых гарантый падчас скарачэння для жанчын з дзецьмі ва ўзросце ад 3 да 5 гадоў наша заканадаўства не прадугледжвае. Як няма тут ніякіх «прывілей» і для асобаў перадпенсійнага ўзросту: мужчын, якія дасягнулі 58, і жанчын, якія дасягнулі 53 гадоў. Дзеля справядлівасці, вызначаць «імунітэт» для асобаў у перадпенсійным узросце ўсё ж рэкамендуе Генеральнае пагадненне — іншымі словамі, падобную норму пажадана замацаваць у калектыўным дагаворы арганізацый.

Разам з тым, падкрэслівае Уладзімір Шэлковіч, няма ў заканадаўстве і патрабавання — «пазбаўляцца» падчас скарачэння ад работнікаў-пенсіянераў. Пакідаць або не пакідаць іх на ранейшых месцах — выбар выключна наймальніка.

Пасля атрымання папярэджання аб скарачэнні работніку абавязкова выдзяляецца адзін свабодны дзень у тыдзень без захавання зарплаты для вырашэння пытанняў аб самастойным далейшым працаўладкаванні ў іншых наймальнікаў.

Працаваць. Аднак шукаць

Папярэджанне аб будучым скарачэнні ёсць. Ці значыць гэта, што ў час да звальнення работнік можа проста не з'яўляцца на сваім месцы і шукаць іншыя варыянты працаўладкавання?

— У час дзеяння папярэджання аб будучым скарачэнні статус работніка не змяняецца, ён па-ранейшаму павінен выходзіць на сваё месца, выконваць патрабаванні працоўнай дысцыпліны — у адваротным выпадку можа адбыцца звальненне за прагул ці за іншыя правіны, — адзначае Уладзімір Шэлковіч. — Разам з тым заканадаўства прадугледжвае: пасля атрымання папярэджання аб скарачэнні работніку неабходна выдзяліць адзін свабодны дзень у тыдзень без захавання зарплаты для вырашэння пытанняў аб самастойным далейшым працаўладкаванні ў іншых наймальнікаў. І больш за тое: паводле дамоўленасці з наймальнікам такі свабодны дзень у тыдзень можа аплачвацца.

Як папярэдзіць «крайнія меры»?

Увогуле, калі ёсць аб'ектыўныя эканамічныя ўмовы, супрацьстаяць скарачэнню цяжка. Іншая рэч — дамагчыся, каб звальненне адбывалася без парушэнняў. Так, нагадвае Уладзімір Шэлковіч, заканадаўства патрабуе, каб не пазней чым за два тыдні да скарачэння аб ім паведамілі ў прафкам. З тым, каб прафкам меў час «пазмагацца» за работніка, абмеркаваць з наймальнікам усе магчымыя варыянты. Да слова, некаторыя арганізацыі ў сваіх калектыўных дагаворах ідуць далей і вызначаюць норму: звальненне па скарачэнні можа адбыцца толькі са згоды прафкама.

— І ўсё ж ці не самы дзейсны сродак у такой сітуацыі — той жа калектыўны дагавор, — падкрэслівае Уладзімір Шэлковіч. — Паўтаруся, што ў калдагаворы можна вызначыць, якія катэгорыі работнікаў скарачаць немагчыма, можа быць вызначаны большы за 3-месячны памер выхадной дапамогі, большы за 2-месячны тэрмін папярэджання і г.д. Прычым варта заўважыць: не трэба думаць, што ў падобных дадатковых гарантыях зацікаўленыя толькі шэраговыя супрацоўнікі. Не меншы інтарэс павінен быць і ў адміністрацыі, прадстаўнікі якой — тыя ж наёмныя работнікі.

Пытанні аднаўлення на ранейшым месцы вырашаюцца толькі ў судзе.

«Вяртаюцца» праз суд

Калі звальненне па скарачэнні ўсё ж адбылося, варта памятаць: правесці канчатковы разлік, і ў тым ліку па выхадной дапамозе, абавязаныя ў апошні дзень працы. Гэтаксама ў апошні дзень павінны аддаць «на рукі» і працоўную кніжку. У адваротным выпадку за кожны дзень «адтэрміноўкі» работніку павінен налічвацца яго сярэдні заробак.

Тым часам, ці можна пасля скарачэння... аднавіцца на ранейшым месцы?

— Калі скарачэнне было праведзена з парушэннямі заканадаўства, то варыянт аднаўлення цалкам рэальны, — адзначае Уладзімір Шэлковіч. — Скажам, падставамі для «вяртання» могуць быць непрапанаванне вакансій, звальненне без уліку паказчыкаў вытворчасці працы ці кваліфікацыі, урэшце, сітуацыя, калі работнік скарачаецца, а ў хуткім часе на яго ж месца прыходзіць іншы чалавек. Аднак неабходна памятаць: у любым выпадку пытанні аднаўлення вырашаюцца толькі праз суд. Плаціць судовую пошліну ў гэтым выпадку не давядзецца, аднак звярнуцца ў суд трэба не пазней чым праз месяц пасля звальнення.

Застаецца толькі дадаць, што прававыя парады па «працоўных пытаннях», і ў тым ліку па пытаннях аднаўлення пасля скарачэння, могуць даць у юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў ці ў юрыдычнай кансультацыі калегіі адвакатаў. Прычым у абодвух выпадках — зноў-такі бясплатна.

Сяргей ГРЫБ.

БІЗНЭС З ЕЎРАПЕЙСКІМ РАЗМАХАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ацэньваючы цяперашнія ўзаемаадносіны з беларускім бокам, **Ута ЦАПФ, старшыня Рабочай групы ПА АБСЕ па Беларусі, падкрэсліла:** «Мы адчуваем зараз, што справы ідуць значна больш хутка і лёгка, і дыялог ідзе больш жвава і карысна як з прадстаўнікамі парламента, так і з прадстаўнікамі Адміністрацыі. І калі мы гутарылі з прадстаўнікамі апазіцыі і з членамі няўрадавых арганізацый, мы адчулі, што і іх жыццё стала крыху лягчэйшым. Хоць, вядома ж, трэба адзначыць, што прагрэс мог бы быць больш прыкметным». Спадарыня Цапф не заўважыла радыкальных зменаў да лепшага па сітуацыі ў Беларусі, больш удалым яна палічыла ахарактарызаваць гэты прагрэс як рух невялікімі крокамі. «Аднак ужо тое, што ўрад хоча весці дыялог і мае намер прыступіць да перагляду заканадаўства ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі, само гэта жаданне выклікае павагу і жаданне працягваць кантакты», — рэзюмавала палітык. Знакам станоўчых перамен яна назвала новы закон аб СМІ, «які быў прыняты з улікам рэкамендацый і паправак, выказаных міжнароднай супольнасцю». У якасці памкненняў да супрацоўніцтва яна абазначыла «ўцягванне і ўключэнне Беларусі ў еўрапейскую палітыку добрасуседства» і дадаткова акцэнтавала, што «Беларусь зможа многае выйграць ад гэтага». Звяртаючыся да тэмы семінару, Ута Цапф адзначыла, што не варта называць канкрэтныя фірмы і канкрэтных інвестараў, якія маглі б укласці тут сродкі. «Куды больш важна стварыць агульнае асяроддзе — тое, што мы называем кліматам, гэта ў першую чаргу рамачная аснова — заканадаўчая, падатковая, прававая, адміністрацыйная, якая б садзейнічала прыцягненню інвестыцый у Беларусь у цэлым. Такая наша задача». На думку **кіраўніка офіса АБСЕ ў Мінску Ханса-Ёхана ШМІДТА,** агульная інфраструктура, падатковая сістэма, сістэма страхавання — гэта якраз тыя сферы, да якіх за мяжой праяўляецца вялікая цікавасць. «Яны павінны быць палепшаны ў першую чаргу, мяркую, што ўрад Беларусі разумее гэта і робіць правільныя крокі ў патрэбным кірунку».

Выступаючы на семінары, **намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй ТУР** зрабіў акцэнт на важкім унёску, які могуць зрабіць малыя прадпрыемствы ў мінімізацыю наступстваў фінансава-эканамічнага крызісу, паколькі ва ўмовах крызісу ў інвестараў «давер да буйных праектаў невялікі». Ён нагадаў пра меры па стымуляцыі малога прадпрымальніцтва, прадугледжаныя планам па лібералізацыі ў сферы эканамічных адносінаў. *У той час, як у краінах ЕС малы і сярэдні бізнэс адыгрывае ключавую ролю ў эканоміцы.* Паводле інфармацыі, прыведзенай **Лючыа Вінхаса ДЭ СОУЗА, які на семінары прадстаўляў Еўрапейскую камісію,** сектар па Беларусі, доля малога і сярэдняга бізнэсу ў ВУП Еўрасаюза складае 58 % (у нашай жа эканоміцы, паводле слоў спадара Тура, гэты паказчык складае каля 40 %), на іх занятыя каля 70 % працаўнікоў.

Галіна ПАЛЯНСКАЯ, старшыня пастаянай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі сфакусавала сваё выступленне на Інвестыцыйным кодэксе, які быў прыняты камісіяй у 2001 годзе. Як пракаментавала дэпутат карэспандэнту «Звязды», «не многія краіны могуць пахваліцца наяўнасцю інвестыцыйнага кодэксу. Сёння тут вельмі многа гутараць пра ўдасканаленне заканадаўчай базы. Апошнія нарматыўныя дакументы, якія з'явіліся ў сувязі з лібералізацыяй, думаю, запатрабуюць зменаў у Інвестыцыйным кодэксе. Аднак ён досыць прагрэсіўны. Гэта той дакумент, па якім могуць працаваць інвестары ў нашай краіне. Для нас гэта самае галоўнае». Уражанні ад семінару ў старшыні камісіі пазітыўныя: «Дыскусія ёсць — і гэта самае галоўнае. Абмен меркаваннямі — гэта вельмі важна, яны могуць быць самымі рознымі, іх трэба выслухоўваць».

Спадзяёмся, што ад слова да справы часу пройдзе няшмат, і дыскусіі абернуцца канкрэтнымі праектамі, рэальным эфектам у рабоце бізнэсменаў, а значыць, і ў эканоміцы краіны.

Ала МАЧАЛАВА.

БЕЛАРУСКІ САЮЗ ЖУРНАЛІСТАЎ ЗАКЛІКАЎ КАЛЕГ НЕ СПЕКУЛЯВАЦЬ НА ЧУЖЫМ ГОРЫ

Сакратарыят грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў» выступіў з заявай у сувязі з шуміхай, паднятай у апазіцыйнай прэсе, а таксама старшынёй Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ) Жаннай Літвіной з прычыны трагічнай смерці жыхаркі Салігорска Яны Паляковай.

У заяве падкрэсліваецца, што гэта робіцца «для самарэкламы і ў палітычных мэтах». «Ігнаруецца той факт, што адразу ж пасля суда над Паляковай, якая ўчыніла лжывы данос на супрацоўніка міліцыі Віктара Пугачова, радыёстанцыя «Свабода» выступіла з матэрыялам, у якім утрымліваецца зневажальная характарыстыка Паляковай. Зараз кіраўнік БАЖ Жанна Літвіна і прадстаўнікі некаторых інтэрнэт-выданняў перакладваюць адказнасць на дзяржаўныя СМІ. Гэта, па меншай меры, некарэктна!» — адзначаецца ў заяве.

Сакратарыят Беларускага саюза журналістаў лічыць, што любая з'ява ў жыцці мае фактычную аснову і ацэньваецца найперш з прававога пункту гледжання, і з такіх пазіцый павінна быць ацэненая любая публікацыя СМІ.

«Тое, што цяпер з шумам, тэндэнцыйна і бяздоказна робяць кіраўнікі БАЖ і іншых апазіцыйных структур вакол бяды, якая здарылася з Янай Паляковай, нагадвае ашалелыя скокі на касцях і таму з'яўляецца амаральным. Мы мяркуем, што поўную і аб'ектыўную карціну таго, што здарылася, можа даць толькі афіцыйнае расследаванне. Эмоцыі і адкрытае палітыканства тут не да месца. Тым больш недапушчальная спекуляцыя на чужым горы», — гаворыцца ў заяве сакратарыята Беларускага саюза журналістаў.

Кар. БЕЛТА.

НА ПАЛЯВАННЕ — З ЛУКАМ ЦІ АРБАЛЕТАМ? Або з лоўчымі птушкамі?

Міністэрства лясной гаспадаркі зараз распрацоўвае парадак вальернага паляванне — занятку, добра вядомага ў шэрагу замежных краін, але цалкам новага да нядаўняга часу для Беларусі. Пра гэта, у прыватнасці, згадвалася на цырымоніі адкрыцця днямі ў Мінску веснавой спецыялізаванай выставы-кірмашу «Паляванне і рыбалоўства. Актыўны адпачынак 2009». Пра тое, што яно сабой уяўляе, больш падрабязна мы папрасілі расказаць спецыялістаў упраўлення паляўнічай гаспадаркі Мінлясгаса.

Вальеры ўяўляюць сабой агароджаныя ўчасткі лясных угоддзяў, на якіх дзікія жывёлы хоць і абмежаваныя ў перасоўванні, тым не менш умовы іх пражывання максімальна набліжаныя да натуральных. Вальеры могуць быць рознымі па плошчы, адпаведна, і па сваім прызначэнні.

— Зараз мы рыхтуем праект укаранення і выкарыстання вальернага палявання для дзяржаўных прыродаахоўных устаноў. Згодна з ім, вальеры прапануецца падзяліць на тры катэгорыі, — патлумачылі рэдакцыі. — Першы будзе прызначаны для муштравання паляўнічых сабак. Па плошчы такія вальеры будуць самымі невялікімі — па 3—4 гектары. Туды будуць запускаць, скажам, дзіка, а потым для муштравання — лаек. Другая катэгорыя вальераў будзе мець плошчу каля 30 гектараў. Недзе ў снежні-студзені сюды будуць завозіць аленяў, а пасля таго, як яны прынясуць патомства, дзесьці ў маі для іх расчыняць браму і выпусцяць у лясныя ўгоддзі. Нарэшце, вальеры плошчай больш за 100 гектараў. Два гады таму такія былі створаны ў Астраўцы і Лепелі, куды завозілі аленяў і ланяў. Апошніх выпускаць ва ўгоддзі нельга з-за пагрозы знішчэння іх драпежнікамі, тымі ж ваўкамі. Але ў такіх вальерах аленяў, ланяў можна будзе потым адлоўліваць для рассялення або арганізоўваць тут вальернае паляванне. У нацыянальныя парку «Прыпяцкі», дарэчы, ужо дзейнічае такі вальер плошчай каля 3 тысяч гектараў.

Як паведамілі нам далей, у правілы вальернага палявання плануецца ўнесці пункт аб дазволе выкарыстання нароўні з агнястрэльнай паляўнічай зброяй лукаў і арбалетаў. Дарэчы, у 2005 годзе яго ўжо спрабавалі ўкараніць, аднак у выніку ён так і не быў зацверджаны. Хоць у іншых краінах выкарыстанне такой зброі дазволена пры паляванні і ў дзікай прыродзе. У нас паляванне з лукам і арбалетам плануецца дазволіць толькі пры вальерным паляванні.

Зараз у Міністэрстве лясной гаспадаркі сумесна з Міністэрствам прыродых рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў распрацоўваецца таксама парадак новага для краіны віду палявання — з лоўчымі птушкамі. Хоць, па словах суразмоўцы, іх выкарыстанне Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання не забаранялася і дагэтуль. Аднак цяпер трэба падрабязна рэгламентаваць шэраг пытанняў па выкарыстанні на паляванні лоўчых птушак. Як прагучала зноў жа на адкрыцці спецыялізаванай выставы-кірмашу, у міністэрства звярнуліся паляўнічыя з Мінскай і Віцебскай абласцей з прапановай аб увядзенні ў Беларусі менавіта такога новага віду палявання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УНП 101099370

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

РУП «Белспецконтракт» проводит 3-й открытый на нижеследующее имущество повторный аукцион по продаже объектов республиканской собственности 20 марта 2009 года.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
2	грузовой Урал-43202 шасси № 036070, дв. № 730591	войсковая часть 05733, г. Гродно	1985	73461	10 000 000	1 000 000
3	грузовой Урал-43202 шасси № 039877, дв. № 765711	войсковая часть 14103, г. Новогрудок	1985	84129	10 000 000	1 000 000
6	костюм Л-1 — 500 шт.	войсковая часть 42747, г. Ст. Дороги	1974—1980		15 000 000	1 500 000

3-й аукцион состоится в 11.00 **20 марта 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 **18 марта 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 20 марта 2009 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 54 15.
Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.

Абзац

■ Пасяўныя плошчы грэчкі ў Беларусі сёлета плануецца павялічыць да 23,6 тыс.га, што амаль удвая больш, чым летась. Пра гэта паведаміў на пасяджэнні калегіі Мінсельгасхарчу краіны намеснік міністра Васіль Паўлоўскі, перадае БелТА.

■ **Полацкія мытнікі затрымалі буйную партыю цыгарэт — 292,5 тыс. пачкаў на суму каля Br414 млн, паведамілі БелТА ў прэс-службе дзяржаўнага мытнага камітэта. У грузавым аўтамабілі DAF, які ехаў з Расіі ў Латвію праз пункт пропуску «Урбаны», згодна з дакументам правозіліся ніткі. Аднак мытнікі выявілі незаяўленыя цыгарэты. Аўтамабіль затрыманы, цыгарэты канфіскаваныя, праводзяцца следчыя мерапрыемствы.**

■ У суд накіраваная справа па абвінавачванні трох урачоў Івацэвіцкай райбальніцы ў тым, што з-за іх непрафесійных дзеянняў пры правядзенні штучнай вентыляцыі лёгкіх у студзені мінулага года памерла дзіця.

■ **У Мінскай вобласці 10 сакавіка сапёры двойчы абясшкоджвалі боепрыпасы часоў мінулай вайны. У Заслаўі мінамётная міна з узрывальнікам была выяўленая пры будаўнічых работах у філіяле мэблевай фабрыкі. Сапёрамі выяўлены і знішчаны тры 120 мм мінамётныя міны. А ў Старобіне Салігорскага раёна ў канаве знойдзены тры снарады рознага калібру. Яны таксама знішчаныя.**

■ Віцебскія фінансавыя міліцыянеры спынілі дзейнасць групы віцябчан, якія займаліся нелегальнай перавозкай пасажыраў па міжнародных маршрутах. Трое жыхароў горада аб'ядналі намаганні і ўласныя транспартныя магчымасці і дастаўлялі кліентаў у аэрапорты сталіц суседніх краін, у прыватнасці, у Маскву і Кіеў, а таксама забіралі там тых, хто прыляцеў. Пры гэтым ліцэнзіі на такі від дзейнасці ў іх не было. Яны атрымалі даход ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці ў памеры каля Br40 млн. Узбуджана крымінальная справа.

■ **Адбыўся суд над асістэнтам кафедры хірургіі Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, які браў са студэнтаў матэрыяльнае ўзнагароджанне за допуск да экзаменаў, залікі і курсавыя работы. Сума, «зароблена» асістэнтам за год, склала Br350 тыс., а прызначаны судом тэрмін за атрыманне хабару — 6 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.**

■ Па ацэнцы спецыялістаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, пік смяротнасці ад СНІДу прыйдзецца на найбліжэйшыя 5 гадоў. Сёлета ў свеце ад гэтай хваробы могуць памерці 2,2 млн. чалавек, а максімум лятальных канцоў (2,4 млн) прыйдзецца на 2012 год. Потым смяротнасць ад СНІДу пойдзе на спад, мяркуюць спецыялісты.

■ **У Маскве на вуліцы з-за дарожнай спрэчкі (каму праехаць першым) сутыкнуліся вадзіцелі аўтамабіляў ВАЗ-2105 і ВАЗ-2109. Шэраговы ранішні канфлікт аўтааматараў прывёў да вялікай трагедыі — вадзіцель «дзявяткі» выхапіў пісталет-кулямёт і адкрыў агонь па «пяцёрцы». Вадзіцель апошняй і яго пасажыр атрымалі па некалькі агнястрэльных раненняў і былі дастаўленыя ў бальніцу. Той, хто страляў, з месца здарэння знік.**

Поўны абзац

■ Жыхарцы Вялікабрытаніі пагражае турэмны тэрмін за тое, што падчас пацалунку яна адкусіла свайму каханку трэць языка. 40-гадовая жанчына выпівала ў свайго 45-гадовага сябра, а затым стала яго цалаваць і ўчапілася зубамі ў ягоны язык. Няшчаснаму ўдалося вырвацца з абдымкаў, аднак кавалак яго языка застаўся зубах каханкі. Мужчына падаў у суд, паколькі пасля ранення ён пачаў адчуваць цяжкасці пры маўленні і страціў здольнасць нармальна адчуваць смак ежы. Чакаецца трэцяе пасяджэнне суда.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ОАО «МИНСКИЙ ПРИБОРОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ:

- **Автомобиль** МАЗ 53366022, 1994 года выпуска. Начальная цена продажи: 33 000 000 руб. с НДС.
- **Автомобиль** КАМАЗ 53213, 1998 года выпуска. Начальная цена продажи: 15 000 000 руб. с НДС.

Задаток в размере 5 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится **13 апреля 2009 года** в 13.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58. Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 **10 апреля 2009 г.** по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58.

Справки по телефону: 8 017 293 99 60;
факс 8 017 331 41 97.

УНП 100363840.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и на право заключения договора аренды земельного участка с установлением начальной цены продажи неиспользуемого государственного имущества, равной одной базовой величине

Наименование предмета аукциона	Здание гаража и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., г. Жабинка, ул. Буденного, 5
Продавец недвижимого имущества	Главное статистическое управление Брестской области, тел. (0162) 23 70 69
Характеристика предмета аукциона	Здание одноэтажное, площадь – 91 кв. м, 1975 г.п., мощение асфальтобетонное 32,2 кв. м Земельный участок площадью 0,0134 га; срок аренды – 50 лет
Условия аукциона	• осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее одного года; • создание покупателем не менее трех дополнительных рабочих мест в течение одного года; • запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи в течение одного года.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	498 270*
Сумма задатка, руб.	49 800
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by*

** определена как сумма начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены продажи права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.*

Аукцион состоится **14 апреля 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538.

3. Негосударственными юридическими лицами – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Индивидуальными предпринимателями – нотариально заверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранными негосударственными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны

НОВЫ ЧАС НАРОДНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такая раскладка, на думку палітыка, патрабуе ад парламентарыяў новага падыходу, пастаяннай гатоўнасці да імгненных перамен, мабільнасці. *«Трэба, каб усе дзяржаўныя структуры былі гатовыя да работы ў новых умовах. Кажуць, што раней было прасцей працаваць, калі ты ведаў, што пазіцыя жорсткая — так і гэтак. А калі ты ведаеш толькі вынік, на які трэба выходзіць, гэта ўжо цяжэй... Вынікам павінна стаць канструктыўнае, узаемавыгаднае, раўнапраўнае супрацоўніцтва, і як яго дасягаць, трэба думаць пастаянна. Тут рэцэптаў ніякіх няма. Мы ўсе павінны працаваць на тое, каб нашы еўрапейскія калегі ўсвядомілі, што Беларусь — гэта еўрапейская суседка, узаемадзеянне з якой адпавядае інтарэсам самой Еўропы. Мы гатовы зрабіць свой істотны ўнёсак у рашэнне агульнасусветных і еўрапейскіх праблем — такіх, як забеспячэнне бяспечных стабільных паставак нафты і газу, развіццё трансеўрапейскіх транспартных калідораў, ахова навакольнага асяроддзя, барацьба з кліматычнымі зменамі. Кожны з гэтых выклікаў патрабуе аб'яднання намаганняў усіх членаў вялікай еўрапейскай сям'і».*

Не маглі мы не запытацца і пра меркаванне дэпутата наконт шанцаў аднаўлення статуса спецыяльнага запрошанага для парламента Беларусі ў ПАСЕ. — *Натуральна, мне хочацца верыць, што статус будзе адноўлены, — адзначае Сяргей Маскевіч. — Мяркую, гэта і ў нашых інтарэсах, і ў інтарэсах Еўропы. Мне так думаецца, што сітуацыя ў нашай краіне, якая ўсебакова вывучаецца рознымі еўрапейскімі спецыялістамі, будзе правільна ацэнена. Ёсць агульная зацікаўленасць у тым, каб Беларусь развівалася ў тым жа кірунку, што і ўвесь, уласна кажучы, цывілізаваны свет, і была актыўным удзельнікам гэтых працэсаў. І гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі еўрапейскі бок будзе супрацоўнічаць перш за ўсё з афіцыйнымі структурамі, якія рэальна кіруюць працэсам у рэспубліцы. Важным крокам павінен стаць адыход Савета Еўропы ад негатыўных стэрэатыпаў, якія склаліся ў дачыненні да Беларусі, і разгляд краіны ў якасці раўнапраўнага партнёра. Апошнім часам Беларусь зрабіла шэраг канкрэтных крокаў насустрач Савету Еўропы. Так, пашырыліся магчымасці для недзяржаўных выданняў друкавацца і распаўсюджвацца на тэрыторыі краіны, пачаўся прадметны дыялог з АБСЕ па пытаннях удасканалення выбарчага заканадаўства і практыкі яго прымянення, створаны Грамадска-кансультацыйны савет пры Адміністрацыі Прэзідэнта, Грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі пры Мінінфарме, дзейнічаюць рабочыя групы пры міністэрствах эканомікі і замежных спраў з удзелам незалежных эканамістаў і прадпрымальнікаў.*

Дзейнасць у парламенцкай асамблеі, на думку палітыка, азначае для Беларусі раўнапраўны ўдзел у еўрапейскіх працэсах. *«Мы будзем мець магчымасць з трыбуны выказаць свой погляд на любую праблему. Гэта самае галоўнае. Мэты і задачы супрацоўніцтва ў рамках асамблеі — аптымізацыя ўсіх формаў узаемадзеяння, уніфікацыя заканадаўства, звязаная з магчымасцю рэалізацыі кожным чалавекам сваіх правоў, ініцыятыў».*

Як кіраўнік профільнай камісіі, Сяргей Маскевіч займаецца найперш каардынацыяй работы парламентарыяў па міжнародных кірунках, непасрэдна ж ён бярэ ўдзел у міжпарламенцкім супрацоўніцтве па ўсходнім вектары. Так дэпутат з'яўляецца намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, а таксама ўдзельнічае ў рабоце адной з камісій Міжпарламенцкай Асамблеі СНД. *«Найбольш прасунутае міжпарламенцкае ўзаемадзеянне па ўсім спектры пытанняў у нас, безумоўна, з Расіяй. Парламенцкі сход абмяркоўвае аспекты рэальнага супрацоўніцтва дзвюх краін у фарміраванні адзінай прасторы — палітычнай, эканамічнай, культурнай. Парламенцкая Асамблея ЕўрАзЭС, ПА АДКБ, ПА СНД — структуры, якія выконваюць вельмі важную ролю ў тым, каб краіны змаглі ўніфікаваць заканадаўства, у пастаянным кантакце выпрацаваць аптымальныя формы супрацоўніцтва, якія сёння ў найбольшай ступені адпавядаюць іх інтарэсам».*

Асаблівую ўвагу ў камісіі надаюць прафесійнай падрыхтоўцы дэпутатаў і актывізацыі міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Парламентарыі наведалі ўжо Міжнароднае таварыства дружбы народаў, пабывалі ва ўніверсітэтах — у прыватнасці, у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, дзе займаюцца перападрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі спецыялістаў, у тым ліку і па кірунку міжнародных дзейнасці, праведзена вучоба і для кіраўнікоў міжпарламенцкіх груп, а таксама іх намеснікаў. *«Палітыка, якую праводзіць наша камісія, — гэта максімальнае ўцягванне ўсіх дэпутатаў у міжнародную дзейнасць. У кожнага з іх свой вопыт, свая акруга і праблемы ў ёй. Парламентарыі маюць карт-бланш ад народа, і падчас сустрэч і перамоў на міжнародным узроўні яны выражаюць настроі людзей, а на сустрэчах з выбаршчыкамі — інфармуюць іх пра тое, што было абмеркавана, што дазволіла нейкім чынам вырашыць праблему. Гэта тое, што мы называем народнай дыпламатыяй. Абмяркоўваючы пытанні на міжнароднай трыбуне, парламентарыі прыводзяць у судакрананне народныя спадзяванні, настрої сваіх выбаршчыкаў»*, — запэўніў нас Сяргей Маскевіч.

Падзяліўся ён і планамі работы ў камісіі: *«У хуткім часе мы правядзём выязное пасяджэнне ў СЭЗ «Гомель-Ратон». Гэта дазволіць нам глыбока вывучыць праблемы, што ўзнікаюць у дзейнасці свабодных эканамічных зон, выпрацаваць шляхі іх прававога рэгулявання».* Наспела таксама неабходнасць зменаў у Мытным кодэксе — у прыватнасці, таму, што патрэбна ўніфікацыя ў рамках ЕўрАзЭС, варта максімальна наблізіць прававыя нормы да рэалій цяперашняга часу, паклапаціцца пра забеспячэнне аператыўнасці і мабільнасці работы мытных службаў. Так што дэпутатаў чакае сур'ёзная работа, аднак і зроблена ў гэтым кірунку, на думку палітыка, ужо нямала: *«Мы тут ужо шмат чаго паспрабавалі і можам раіць іншым. Прынамсі, многія рэспублікі адзначаюць, што ў плане рэгулявання міжнародных эканамічных адносінаў у нас ёсць сур'ёзныя напрацоўкі. Палажэнні Мытнага кодэкса Беларусі былі скарыстаныя пры падрыхтоўцы мадэльнага Мытнага кодэкса дзяржаў—удзельніц СНД».*

Цяпер у камісіі працуюць над папраўкамі ў некаторыя законы па пытаннях прававога палажэння замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства ў нашай краіне, а таксама па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Увесну дэпутаты разгледзяць іх у Авальнай зале ў першым чытанні. І як заўжды, Камісія па міжнародных справах і сувязях з СНД рыхтуе мноства законапраектаў, што датычацца ратыфікацыі міжнародных дагавораў Беларусі. Сярод ратыфікаваных у гэтым скліканні дакументаў Сяргей Маскевіч асабліва адзначыў пагадненне паміж Беларуссю і Камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў: *«Яно мае вельмі важнае значэнне, бо вызначае канкрэтныя прававыя нормы, паводле якіх прадстаўнікі еўрапейскіх камісій будуць працаваць тут. Яны прыраўноўваюцца да дыпламатычных працаўнікоў, тым самым адкрываюцца магчымасці для супрацоўніцтва, актыўнай работы ў заходнім кірунку».* На чарговай сесіі парламентарыям прапануецца разгледзець праекты законаў аб ратыфікацыі дагавора з Сірыяй аб прававой дапамозе па грамадзянскіх і крымінальных справах, канвенцыі паміж Беларуссю і Лівіяй аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання. Чакаецца паступленне больш як трох дзясятка законапраектаў аб ратыфікацыі міжнародных дамоў у рамках АДКБ, СНД, Мытнага саюза і іншых. Вясновая сесія абяцае быць досыць насычанай, графік міжнародных сустрэч вельмі напружаны. Новы перыяд у рабоце народных дыпламатаў распачаты, мы з цікавасцю будзем сачыць за ёй.

Ала МАЧАЛАВА.

«ЦЫГАРЭТНЫ» ПЛЫТ

Якія толькі транспартныя сродкі не выкарыстоўваюцца для кантрабанды... Нават ... плыт, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Супрацоўнікі міліцыі сумесна з вайсковцамі в/ч 2141 затрымалі літоўскага грамадзяніна на беразе Нёмана каля вёскі Паднямнова Гродзенскага раёна. Выкарыстоўваючы плыт, мужчына спрабаваў перамясціць на тэрыторыю Літвы 27059 пачкаў цыгарэт на суму амаль 40 мільёнаў 600 тысяч рублёў. Але «нумар» не прайшоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

САМАРОБНЫ АЛКАГОЛЬ У ЛЕСЕ І Ў ГОРАДЗЕ

У Расонскім раёне ў лесе міліцыянеры знайшлі міні-завод па вырабе самагону. Канфіскавалі 360 літраў самагоннай брагі, больш за 40 літраў самагону. Шукаюць гаспадароў незаконнай вытворчасці. А ў абласным цэнтры міліцыянеры ў прыватным гаражы знайшлі больш за 147 літраў вадкасці на аснове спірту. У дачыненні да ўладальніка склалі адміністрацыйны пратакол. Высветлілі, што ён рэалізаваў грамадзяніну каля 70 бутэлек гарэлкі без айчынных акцызных марак. Выходзіць — і ён, праўда, у горадзе, вырабляў алкаголь.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СКАЛАЛАЗАМ НА ГАДЗІНУ

адчуў сябе 53-гадовы жыхар вёскі Батвінава, што ў Чачэрскім раёне. Мужчына займаўся мантажом тэлеантэны на даху двухпавярховага дома і зваліўся з яго. Пры гэтым яму пашанцавала трапіць на казырок на ўзроўні першага паверха. Пасля таго, як медсястра на месцы падзення зрабіла пацярпеламу абязбольваючы ўкол і наклала шыну на пераламаную нагу, спецыялісты МНС пажарна-паставая часта вёскі Мяркулавічы, якія прыехалі на выклік, надзелі на мужчыну спецыяльную двайную пятлю і па выратавальнай вяроўцы спусцілі яго на зямлю. Пасля гэтай аперацыі няўдалы «скалалаз» быў перададзены брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У 1914 ГОДЗЕ БЕЛАРУСЫ КААПЕРАВАЛІСЯ ЗНАЧНА АХВОТНЕЙ

Праблемы ў стварэнні спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі абмеркавалі прадпрымальнікі, чыноўнікі і замежныя госці з Расіі і Польшчы на «круглым стале» ўчора. «Асноўная праблема — гэта адсутнасць дакладнага заканадаўства, якое рэгламентавала б працу ў крэдытнай сферы. З аднаго боку, калі дазволена ўсё, што не забаронена, то гэта «залаты час», але з другога боку, мы ўсё-такі працуем з грашыма грамадзян, якім патрэбныя гарантыі плюс дакладныя правілы гульні, каб крэдытныя саюзы не сталі перарастаць у фінансавыя піраміды», — абазначыла сваё меркаванне **Алена КАЛЯДА, старшыня праўлення Рэспубліканскай асацыяцыі фінансавай узаемадапамогі.** Па яе словах, зараз дзейнасць крэдытных саюзаў рэгулююць чатыры дакументы, якія патрабуюць перагляду.

Яшчэ да праблемных момантаў Алена Каляда аднесла адсутнасць органа, які б ажыццяўляў функцыі нагляду, недастатковую інфармаванасць насельніцтва пра дзейнасць крэдытных саюзаў і недахоп спецыялістаў. Цікава, што ідэю стварэння нагляднага органа падтрымліваюць не ўсе спецыялісты. Напрыклад, **Ігар МІКУЛЬЧЫК, старшыня праўлення крэдытнага саюза спажывецкай кааперацыі «Кансультацыйна-фінансавы цэнтр «Узаемадапамога»,** лічыць, што патрэбны проста саманагляд і што баяцца фінансавых пірамід не трэба — адпаведныя дзяржорганы за гэтым сочаць і такога не дапусцяць. Не бачыць неабходнасці стварэння нагляднага органа і **Сяргей ЛУГАЎЦОЎ, начальнік упраўлення праектавання дэпартамента міжнародных аперацый Нацбанка Беларусі:**

— У сувязі з тым, што спажывецкая кааперацыя ў Беларусі знаходзіцца на пачатковым этапе развіцця, для таго, каб даць ёй штуршок развіцця, за аснову мы павінны ўзяць самарэгуляванне спажывецкіх кааператываў. Дзяржава павінна ўмяшацца ў гэты працэс тады, калі будзе куды ўмешвацца...

Сапраўды, сёння ў рэспубліцы налічваецца ўсяго 12-14 такіх крэдытных кааператываў, з якіх, па меркаванні Ігара Мікульчыка, рэальна дзейнічае каля пяці. Цікава, што ў далёкім 1914 годзе іх было ажно 74, удзельнікамі якіх былі 23 122 чалавекі.

Дарэчы, на «круглым стале» прысутнічалі людзі, якія сёння рэальна хочуць стварыць новыя крэдытныя саюзы. Іх цікавілі практычныя моманты ў ажыццяўленні такой дзейнасці:

— У нас пры саюзе, — сказаў **старшыня ГА «Беларускі саюз прадпрымальнікаў» Аляксандр КАЛІНІН,** — сёння няма ніводнага крэдытнага кааператыва, але існуюць чатыры ініцыятыўныя групы, якія сёння вывучаюць сітуацыю. І дазвольце спытаць у прадстаўніка Нацбанка, наколькі рэальна ва ўмовах сур'ёзнай інфляцыі беларускага рубля выкарыстоўваць для развіцця кааператыва іншыя валюты, напрыклад, долар?

На што Сяргей Лугаўцоў адказаў так:

— Нават калі пераходзіць на аналаг сям'і, то ўвечары, умоўна, прынёс муж дадому польскія злотыя, а жонка кажа яму: «Ідзі мяняй на беларускія рублі...». Гэта значыць, калі крызіс, у касу павінна паступаць усё што заўгодна, абы гэта былі грошы. Гэта маё ўласнае меркаванне. Афіцыйная пазіцыя заключаецца ў тым, што ў найбліжэйшы час будзе падрыхтаваны ўказ аб дэдаларызацыі, адпаведна мы пераходзім максімальна на беларускі рубель...

Нагадаем чытачам, што крэдытныя саюзы — гэта добраахвотныя аб'яднанні грамадзян або юрыдычных асобаў, якія аказваюць крэдытныя паслугі толькі свайму колу пайшчыкаў. Адна з важнейшых пераваг такіх аб'яднанняў — гнуткасць і аператыўнасць. Напрыклад, удзельнік такога кааператыва можа атрымаць у выпадку востры неабходнасці пазыку на працягу некалькіх гадзін, а ў звычайным банку гэта заняло б некалькі дзён.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЯПОНЦЫ — БЕЛАРУСАМ

Пяты год дзейнічае грантавая дапамога японскага ўрада для медыцынскіх устаноў раёнаў Беларусі, якія найбольш пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Дагаворам прадугледжана выдзяленне ім фінансавых сродкаў на бязвыплатнай аснове для закупкі новага медыцынскага абсталявання.

Так, нядаўна прадстаўнікі пасольства Японіі ў нашай рэспубліцы нанеслі візіт у Буда-Кашалёўскі раён і падпісалі кантракт на атрыманне гранта на 76 тысяч долараў. Другі кантракт заключаны з Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцай, якой будзе выдзелена каля 70 тысяч «зялёных». А калі падсумаваць вынікі дзейнасці японскай праграмы «Грантавая дапамога для праектаў па бяспецы насельніцтва» — а Японія таксама пацярпела ад атамнага ўдару — дык яна выражаецца ў лічбе каля 700 тысяч долараў. Столькі валюты было выдзелена для дзевяці медыцынскіх устаноў Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Ёсць пытанне

Ці трэба плаціць за прапушчаныя лекцыі і лабараторныя заняткі?

Падкажыце, калі ласка, ці ёсць законныя падставы для спагнання са студэнтаў бюджэтнай формы навучання грошай за прапушчаныя лекцыі або практычныя заняткі? І якім чынам разлічваецца памер штрафных санкцый за прагул?

Р.М., *г.Мінск.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як патлумачыла карэспандэнту «Звязды» **начальнік упраўлення сацыяльна-эканамічнага развіцця Міністэрства адукацыі Лідзія СУБОЦКАЯ,** пералік платных паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі, быў зацверджаны Пастановай Савета Міністраў ад 3 кастрычніка 2002 года № 1376. 18 студзеня 2008 года ў яго былі ўнесены дапаўненні, якія тычацца бягучай атэстацыі студэнтаў. Згодна з апошняй рэдакцыяй гэтага дакумента, на платнай аснове ажыццяўляецца арганізацыя выніковай атэстацыі для асобаў, якія не здалі дзяржаўныя экзамены ці не абаранілі дыпломны праект у вызначаныя вучэбным планам тэрміны, а таксама арганізацыя бягучай атэстацыі для асобаў, якія не здалі экзамены, залікі, не прайшлі іншыя формы кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці, прадугледжаныя вучэбнымі планамі і вучэбнымі праграмамі ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вышэйшых навучальных установах, установах адукацыі (падраздзяленнях устаноў адукацыі), якія забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў.

З экзаменамі і залікамі — усё больш-менш зразумела. Але што маецца на ўвазе пад іншымі формамі кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці?

— Гэта могуць быць кантрольныя работы, лабараторныя работы, практычныя заняткі, абарона рэферату, магчыма, нейкія іншыя віды бягучай атэстацыі, — удакладніла Лідзія Субоцкая. — Калі ёсць што ацэньваць выкладчыку. Але лекцыйныя заняткі ў іх катэгорыю не трапляюць. Прымушаць студэнтаў аплачваць прапушчаныя лекцыі ВНУ не маюць права. А вось арганізацыя персанальна для студэнта лабараторнай работы ці практычных заняткаў патрабуе ад навучальнай установы дадатковых выдаткаў. І кампенсаваць іх навучальнай установе павінен студэнт-прагульшчык. Стварыць універсальную для ўсіх навучальных устаноў сістэму разліку памеру кампенсацыі немагчыма, паколькі калькуляцыя залежыць ад непасрэдных выдаткаў і спецыфікі дысцыпліны. Бярэцца пад увагу, напрыклад, кваліфікацыя выкладчыка, ад якой залежыць памер адлічэнняў на заработную плату (доктар навук, зразумела, «каштуе» даражэй, чым выкладчык без навуковай ступені), ад віду выніковай атэстацыі (скажам, лабараторная і кантрольная работа ацэньваюцца па-рознаму), ад амартызацыі абсталявання і іншых накладных выдаткаў. Ёсць Інструкцыя аб кошце платнага навучання ў дзяржаўных установах, што забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, зацверджаная пастановай Міністэрства адукацыі ад 20 красавіка 2006 года № 38 з прыкладнай плануемай калькуляцыяй, пастанова Міністэрства адукацыі № 76 ад жніўня 2006 года... Адным словам, нарматыўная прававая база для складання калькуляцыі існуе. Дарэчы, калькуляцыя абавязкова зацвярджаецца кіраўніком навучальнай установы. Усе разлікі — толькі бязнаяўныя. Хачу звярнуць увагу таксама на тую акалічнасць, што калі студэнт прапусціў лабараторную ці кантрольную работу па ўважлівай прычыне, напрыклад з-за хваробы, то на яго «штрафныя санкцыі» не распаўсюджваюцца.

Праўда, наколькі актыўна ВНУ выкарыстоўваюць магчымасць караць прагульшчыкаў рублём, Лідзія Субоцкая адказаць не змагла, заўважыўшы толькі, што інструмент (і юрыдычны, і эканамічны) у іх для гэтага ёсць... Між іншым, піянерам у гэтай справе стаў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, які палічыў, што пакаранне рублём — цудоўны спосаб дысцыплінаваць студэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ОАО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ» за 2008 год

Адрес: 220033, г. Минск, переулок Велосипедный, 7, тел. 298 48 02

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2009 г.

5. Количество акционеров — всего **493** в том числе юридических лиц — **1** физических лиц — **492**

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	**217**	**252**
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	**687**	**710**
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	**62**	**51**
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	**18 405**	**28 471**

7. Информация о задолженности (только в составе годового отчета):

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	**0**	**0**
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	**0**	**0**

9. Среднесписочная численность работающих (человек) — **979**

10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **строительство инженерных сооружений**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 года

Актив	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	22 709	23 748
амортизация	102	10 366	11 873
остаточная стоимость	**110**	**12 343**	**11 875**
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	10	10
амортизация	112	7	7
остаточная стоимость	**120**	**3**	**3**
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121	—	—
амортизация	122	—	—
остаточная стоимость	**130**	**—**	**—**
Вложения во внеоборотные активы	**140**	**9**	**627**
В том числе: незавершенное строительство	141	9	627
Прочие внеоборотные активы	**150**	**—**	**—**
ИТОГО по разделу I	**190**	**12 355**	**12 505**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	**210**	**6 414**	**13 236**
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	3 720	7 367
животные на выращивании и откорме	212	—	—
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	572	886
расходы на реализацию	214	—	—
готовая продукция и товары для реализации	215	1 771	4 568
товары отгруженные	216	—	—
выполненные этапы по незавершенным работам	217	—	—
расходы будущих периодов	218	351	415
прочие запасы и затраты	219	—	
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	**220**	**199**	**232**
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	**230**	**—**	**—**
В том числе: покупателей и заказчиков	231	—	—
прочая дебиторская задолженность	232	—	—
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	**240**	**14 375**	**12 455**
В том числе: покупателей и заказчиков	241	12 898	10 129
поставщиков и подрядчиков	242	262	486
по налогам и сборам	243	—	—
по расчетам с персоналом	244	—	1 365
разных дебиторов	245	418	475
прочая дебиторская задолженность	249	797	—
Расчеты с учредителями	**250**	**—**	**—**
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	—	—
прочие	252	—	—
Денежные средства	**260**	**313**	**3 023**
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	—	—
Финансовые вложения	**270**	**184**	**185**
Прочие оборотные активы	**280**	**16**	**16**
ИТОГО по разделу II	**290**	**21 501**	**29 147**
БАЛАНС (190 + 290)	**300**	**33 856**	**41 652**

Пассив	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	**410**	**496**	**441**
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	**411**	**40**	**26**
Резервный фонд	**420**	**—**	**—**
В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	—	—
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422	—	—
Добавочный фонд	**430**	**16 330**	**18 144**
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	**440**	**—**	**—**
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	**450**	**1 420**	**1 004**
Целевое финансирование	**460**	**—**	**—**
Доходы будущих периодов	**470**	**6**	**—**
ИТОГО по разделу III	**490**	**18 212**	**19 563**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	**510**	**42**	**35**
Прочие долгосрочные обязательства	**520**	**1 015**	**310**
ИТОГО по разделу IV	**590**	**1 057**	**345**

1	2	3	4
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	**610**	**2 079**	**815**
Кредиторская задолженность	**620**	**12 424**	**20 912**
В том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	621	6 871	4 891
перед покупателями и заказчиками	622	865	10 836
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	1 524	1 796
по прочим расчетам с персоналом	624	133	304
по налогам и сборам	625	1 594	1 444
по социальному страхованию и обеспечению	626	453	716
по лизинговым платежам	627	—	—
перед прочими кредиторами	628	984	925
Задолженность перед участниками (учредителями)	**630**	**78**	**17**
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	—	—
прочая задолженность	632	78	17
Резервы предстоящих расходов	**640**	**6**	**—**
Прочие краткосрочные обязательства	**650**	**—**	**—**
ИТОГО по разделу V	**690**	**14 587**	**21 744**
БАЛАНС (490 + 590 + 690)	**700**	**33 856**	**41 652**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	—	—
краткосрочная кредиторская задолженность	702	12 424	20 912

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	01	16	16
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	02	258	13
Материалы, принятые в переработку	03	1 898	2 021
Товары, принятые на комиссию	04	—	—
Оборудование, принятое для монтажа	05	—	—
Бланки строгой отчетности	06	3	3
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	07	—	—
Обеспечения обязательств и платежей полученные	08	—	—
Обеспечения обязательств и платежей выданные	09	—	—
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	177	—
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011	—	—
Нематериальные активы, полученные в пользование	012	—	—
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	—	—
Потеря стоимости основных средств	014	—	2

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2008 г. по 31 декабря 2008 г.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**010**	**83 298**	**68 176**
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	10 873	7 516
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010 – 011)	**020**	**72 425**	**60 660**
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	—	—
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	**030**	**60 600**	**48 602**
Валовая прибыль (020 – 021 – 030)	**040**	**11 825**	**12 058**
Управленческие расходы	**050**	**—**	**—**
Расходы на реализацию	**060**	**—**	**—**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020 – 030 – 050 – 060)	**070**	**11 825**	**12 058**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	**080**	**7 880**	**15 343**
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	**081**	**20**	**12**
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080 – 081)	**090**	**7 860**	**15 331**
В том числе: проценты к получению	091	—	—
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092	—	—
доходы от операций с активами	093	138	82
прочие операционные доходы	099	7 722	15 249
Операционные расходы	**100**	**8 021**	**15 313**
В том числе: проценты к уплате	101	—	—
расходы от операций с активами	102	112	47
прочие операционные расходы	109	7 909	15 266
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090 –100)	**120**	**- 161**	**18**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	**130**	**5 948**	**1 338**
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	**131**	**2**	**22**
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130 – 131)	**140**	**5 946**	**1 316**
Внереализационные расходы	**150**	**12 277**	**8 218**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140 – 150)	**160**	**- 6 331**	**- 6 902**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (± 070 ± 120 ± 160)	**200**	**5 333**	**5 174**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	**210**	**4 672**	**4 893**
Доходы, не учитываемые при налогообложении	**220**	**—**	**4**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (± 200 + 210 – 220)	**240**	**10 005**	**10 063**
Налог на прибыль	**250**	**1 205**	**2 354**
Прочие налоги, сборы из прибыли	**260**	**1 387**	**401**
Прочие расходы и платежи из прибыли	**270**	**13**	**12**
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270)	**300**	**2 728**	**2 407**
Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	**310**	**557**	**—**
Прибыль (убыток) на акцию	**320**	**—**	**—**
Количество прибыльных организаций / сумма прибыли	**330**	1 **2 728**	1 **2 407**
Количество убыточных организаций / сумма убытка	340	—	—

Руководитель **Г.П. Адамович**

Главный бухгалтер **А.В. Козловский**

УНП 100092167

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ 17 апреля 2009 г.

в 11.00 в административном здании Обуховского сельского исполнительного комитета (деревня Обухово, ул. Центральная, 4, Гродненский район) состоится аукцион по продаже в частную собственность земельных участков.

№ лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, в долларах США по курсу НБ РБ на день оплаты	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, белорусских рублей	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории
1	422086003601000067, д. Курпики, уч. № 1, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,2269	для строительства и обслуживания жилого дома	318,57	1 300 000	вдоль участка проходит сеть водоснабжения
2	422086003601000068, д. Курпики, уч. № 2, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,1398	для строительства и обслуживания жилого дома	196,28	1 200 000	вдоль участка проходит сеть водоснабжения
3	422086003601000069, д. Курпики, уч. № 3, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,0753	для строительства и обслуживания жилого дома	107,13	1 000 000	вдоль участка проходит сеть водоснабжения
4	422086008101000048, д. Огородники, уч. № 1, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,1596	для строительства и обслуживания жилого дома	210,67	1 100 000	земельный участок прилегает к дороге с асфальтовым покрытием
5	422086008101000049, д. Огородники, уч. № 2, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,1582

Інфарм-укол

Эмоцыі б’юць у сэрца

Вельмі часта няўменне кіраваць сваімі эмоцыямі прыводзіць да шэрагу захворванняў і тым самым не спрыяе даўгалецці.

Перш-наперш, разбяромся, чаму прынята звязваць эмоцыі з сэрцам. Паводле слоў галоўнай медсястры 18-й мінскай гарадской паліклінікі Ірыны ТКАЧЭНКІ, пад тэрмінам «стрэс» варта мець на ўвазе своеасаблівыя змяненні ў арганізме, якія ўзнікаюць у адказ на пэўнае моцнае ўздзеянне. Тое, што адбываецца ў гэты момант у арганізме чалавека, можна параўнаць з аварыйнай трывогай на баявым караблі. Зладжана і дакладна арганізм пераходзіць у «баявую гатоўнасць». У тысячныя долі секунды нервовая сістэма дасылае «загад» надныракам, якія ў сваю чаргу імгненна выкідваюць у кроў значную колькасць гармонаў адрэналіну і норадрэналіну. Пад уплывам апошніх усе органы і функцыянальныя сістэмы рыхтуюцца да рэакцыі на «сігнал» — пачашчаецца сэрцабіццё, павышаецца крывяны ціск, пашыраюцца сасуды сэрца, пачашчаецца дыханне, павышаецца тонус цэнтральнай нервовай сістэмы.

Што характэрна, у сучасных людзей эмоцыі не абавязкова выражаюцца пэўнымі рухамі: нормы паводзінаў прадугледжваюць неабходнасць стрымлівання апошніх. Так што ў стрэсавай сітуацыі чалавек можа заставацца знешне спакойным, але вегетатыўная бура ўсё адно абрынецца на яго ўнутраныя органы, і ў першую чаргу, на сардэчна-сасудзістую сістэму. Паступова нервовае напружанне прыводзіць да развіцця гіпертанічнай хваробы і іншых сардэчна-сасудзістых захворванняў. Хворыя, якія паступаюць у бальніцу з інфарктам міякарда або гіпертанічным крызам, часта называюць у якасці прычыны развіцця непрыемнага стану праблемы, якія мелі месца на працы ці ў сям’і.

Аднак многія фактары сведчаць аб тым, што чалавек можа перажываць вялікія цяжкасці — і фізічныя, і маральныя — без шкоды для свайго здароўя, і нават наадварот, загартоўвацца пры гэтым. Атрымліваецца, што прычыну большасці хваробаў трэба шукаць не ў знешніх абставінах, а ў псіхалагічнай асаблівасці самога чалавека, ступені яго патрабавальнасці да сябе, здольнасці да самарэгуляцыі сваіх пачуццяў і нават у яго маральна-этычным абліччы.

Культура пачуццяў і эмоцый асабліва праяўляецца ў чалавека ва ўменні перажываць. Пастаянная паглыбленасць у свет уласных перажыванняў, «праігрыванне» ў думках сітуацый, якія адбыліся, або тых, што яшчэ могуць адбыцца, прымушаюць чалавека жыць учарашнім днём, чакаць непрыемных падзей, адчуваць уласную непаўнацэннасць. Мала таго, што чалавек пры гэтым «спальвае» сябе, побач з ім пакутуюць і іншыя людзі.

Вельмі часта няўменне кіраваць сваімі эмоцыямі выліваецца ў няўменне кіраваць сваім жыццём, жаданне схавацца ад праблем у алкагольнымап’яненні ці тым жа курэнні. Усё гэта прыводзіць да сардэчна-сасудзістых захворванняў, якія вылечыць на сёння немагчыма. Але можна папярэдзіць.

Выйсце — на паверхні. Шчасце — гэта наш унутраны стан. Звычка настройваць сябе на станоўчае ўспрыняцце жыцця дае добры настрой, а значыць, здароўе. Абсалютна не навіна, што смутак, страх разбураюць цела, спрыяюць захворванням, набліжаюць старасць. Радасць жа ўзмацняе цела, павышае працаздольнасць, дорыць сілы. З дапамогай спецыяльнай літаратуры або відэакасет асвойвайце метады расслаблення, прымальныя для вас фізічныя нагрузкі, пазнаёмцеся з той жа ёгай. Вы павінны зразумець, што нават самыя лепшыя ўрачы не зробяць ваша жыццё бясхмарным і не будуць за вас правільна дыхаць, харчавацца, трэніраваць цела, а без гэтага немагчыма гаварыць пра стабільны эмацыянальны фон і фізічнае здароўе.

Святлана БАРЫСЕНКА.

У ПАГОНІ ЗА МЕТАЛАМ

У горадзе Ветка ў адну з начэй з двара прыватнага дома нехта «прырабіў ногі» ванне і чыгуннаму радыятару. Міліцыя хутка выйшла на след зламыснікаў. Імі былі маладыя мужчына і жанчына, якія нідзе не працавалі. А ў Калінкавічах зніклі металічныя рыштаванні каля дома, які ўзводзіцца. Нехта ўкраў і металічную лодку-«казанку». Метал у цане?

ЗАСТАЛІСЯ АД ЦЯЛУШКІ РОЖКІ ДЫ НОЖКІ

Была яна вагой у 103 кілаграмы і разам з іншай жывёлай утрымлівалася на малочнатаварнай ферме СВК «Новазенькаўскі» Кармянскага раёна. Рэшткі яе ў выглядзе рожак ды ножак мясцовы люд знайшоў больш як за кіламетр ад фермы. Пажывіўся ялавічынай і невядомы злодзей (зладзеі), які з фермы КСУП «Ненач» Калінкавіцкага раёна некуды звёў карову, кошт якой — 1810 тысяч рублёў.

Адразу дзвюх рагуль пазбавіўся і СВК «Высокі» Рагачоўскага раёна. Іх укралі, выкарыстаўшы транспартны сродак.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Зваротная сувязь

ДЛЯ «ІНШАПЛАНЕЦЯН» — АСОБНЫ ТАРЫФ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Чаму выпускнікі аўташкол правальваюць іспыты ў ДАІ?» (13 лютага 2009 года)

«Давай увечары ў тэатр сходзім», — прапаноўваю добрай прыяцельцы. «Не, толькі не сёння, у мяне курсы па ваджэнні», — паціскае плячыма ў адказ. Злавіла сябе на думцы, што пераважная большасць маіх знаёмых атрымала ці збіраецца атрымліваць пасведчанне на кіраванне аўтамабілем. Цікава, узрослае за апошнія гады жаданне мець правы — гэта даніна модзе ці жыццёвая неабходнасць?..

Адказ на пытанне знайшла ў лісце нашай чытачкі з Мінскага раёна Іны Францаўны. Гэта жанчына пайшла вучыцца ў аўташколу не па прынцыпе «як усе, так і я», а каб набыць просценькую машыну і хутчэй дабірацца на працу. Паводле яе слоў, надакучыла ўжо штодзень паўтары гадзіны трэсціся ў перапоўненай маршрутцы ці гарадскім аўтобусе.

Парада ад спрактыкаванай: «Майце на ўвазе, калі ў вас няма ніякіх дадатковых даходаў, акрамя зарплаты, то забраць хутка неабходную суму нялёгка. Таму, ахвотныя вучыцца, загадзя збірайце грошы. Патэлефанаваць могуць раней, чым вы думаеце, а калі грошай няма, то і чакаць давядзецца да другога званка».

Да экзамену спадарыні Іне яшчэ доўга — амаль уся вучоба наперадзе. Таму чытачка вырашыла падзяліцца з патэнцыйнымі вадзіцелямі цяжкасцямі, з якімі яна сутыкнулася перад тым, як трапіць у шэрагі курсантаў.

«Як толькі я дачакалася сваёй чаргі — напісала заяву ў маі, а патэлефанавалі мне толькі ў лютым — пачала збіраць неабходныя дакументы. Фотаздымкі зрабіць можна нядорага і хутка. Пашпарт ёсць у кожнага. Прайсці медагляд у Заслаўі таксама было проста. Паўтары гадзіны кожны дзень для праходжання вадзіцельскай камісіі ёсць у графіку ва ўсіх неабходных урачоў. Яны на гэты час звычайных пацыентаў не прымаюць, нават талоны для прыёму на гэты час не выдаюцца.

А вось праходжанне псіхіятра і нарколага ў Мінску, прынамсі для мяне, абышлося дорага не толькі ў плане грошай, але і нерваў (але наўрад ці я такая адна!).

Куды ісці, неабыякавыя мінакі растлумачылі як след, пры гэтым папярэдзілі, што неабходныя мне паслугі платныя, таму лепш зайсці па дарозе ў банк. У першым, якое я прыкмеціла, аддзяленні «Белагрпрамбанка» на мяне паглядзелі досыць дзіўна і сказалі, што такую паслугу аказаць не могуць: у мяне не было ні патрэбнага нумара рахунку, ні сумы я не ведаю. Давялося ісці праз дарогу ў «Беларусбанк». Добра хоць там зразумелі, што ўвогуле мне трэба. Праўда, і яны не ведалі рахунку і сумы, але вельмі хутка некуды патэлефанавалі і прынялі плацяжы.

У рэгістратурах абодвух дыспансэраў на мяне глядзелі, як на іншапланецянку, а не на беларуску. І толькі таму, што я прапісана ў Віцебскай вобласці. «Жадаеце плаціць, як усе, едзьце па даведкі ў Віцебск, а інакш давядзецца плаціць па іншых расцэнках», — пачула я ў свой адрас. Вось і давялося даплаціць за паслугу, аказаную ў Мінскім абласным псіханеўралагічным дыспансэры да 7980 беларускіх рублёў (у тры разы больш, чым я ўжо заплаціла). У Мінскім абласным наркалагічным дыспансэры — да 9460. Такім чынам я заплаціла 17 440 рублёў, у той час як людзі з прапіскай у Мінскай вобласці — 5330.

Розніцы ў абслугоўванні, у даведках, у запісах у картках я так і не ўбачыла!

Вось і атрымліваецца, што, абслугоўваючыся ў Заслаўскай паліклініцы, жывучы ўжо год на тэрыторыі Лашанскага сельсавета, я, тым не менш, з’яўляюся жыхаром Віцебскай вобласці.

Загадзя баюся экзаменаў — няўжо з-за маёй пашпартнай прапіскі і ў ДАІ да мяне будзе такое стаўленне, як да іншапланецянкі? А мо проста адправяць здаваць у Віцебск? Не хацелася б, бо гэта дадатковыя нервы і грошы, а ў мяне лішняга няма ні таго, ні другога».

Дапамагчы разабрацца ў гэтай сітуацыі ветліва згадзіліся **галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Людміла АНДРЭЕВА** і **старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнічнага нагляду УДАІ МУС Беларусі Дзмітрый ГАРЫНОВІЧ**.

Людміла АНДРЭЕВА:

«Вадзіцельскую камісію, у склад якой, дарэчы, уваходзяць урач-нарколаг і ўрач-псіхіятр, грамадзяне нашай краіны праходзяць па месцы рэгістрацыі. Агляд правадзіцца на платнай аснове. Гэта прапісана ў пастанове 182 Савета Міністраў.

Іншая справа, калі чалавек, як ваша чытачка, рэальна пражывае на тэрыторыі Мінскай вобласці, а па штампу ў пашпарце — на Віцебшчыне. У гэтым выпадку спадарыні патрэбна прайсці не звычайны сяміхвілінны прафілактычны агляд, а больш працяглую па часе кансультацыю, якая, адпаведна, і каштуе больш.

З якой мэтай гэта робіцца? Як правіла, людзі зацікаўлены схаваць факты ўжывання наркотыкаў ці алкаголю (гэта праблема абвастрылася пасля замены прапіскі рэгістрацыяй), таму для таго, каб сабраць неабходную інфармацыю, трэба з імі паразмаўляць не адну і не дзве хвіліны.

У якасці прыкладу прывяду вам толькі адну гісторыю. Малады чалавек з Полацка, які прыехаў у сталіцу на заробкі, вырашыў атрымаць тут пасведчанне на кіраванне транспартным сродкам. Прыйшоў да нас і пачаў патрабаваць неадкладна выпісаць яму даведку. Калі мы зрабілі запыт па месцы прапіскі (у нас няма адзінай базы звестак уліку па рэспубліцы), высветлілася, што ён з 16 гадоў стаіць на ўліку з дыягназам алкагалізм...

Адным словам, трэба рэгістравацца там, дзе пастаянна пражываеце. І тады падобныя праблемы не ўзнікалі б.

Што датычыцца чэргаў у банках, то, як спажывец, я разумею, што добра было б, каб у нашым дыспансэры можна было на месцы аплаціць паслугі. Але плошча пакуль не дазваляе нам пасадзіць тут касіра.

Акрамя таго, мы заўсёды гатовыя ісці насустрач пацыентам — вось заключылі дамову з «Беларусбанкам», які знаходзіцца ў метрах 20 ад дыспансэра.

Аплаціць даведкі, безумоўна, можна ў любым банку, толькі пры гэтым з вас возьмуць невялікі працэнт за аказанне паслугі. Але для гэтага трэба ведаць нумар рахунку і суму, якую трэба аплаціць (можна даведацца на нашым сайце і па тэлефоне)».

Дзмітрый ГАРЫНОВІЧ:

«Да выдачы медыцынскіх даведак і фарміравання кошту на іх атрыманне УДАІ МУС не мае ніякага дачынення. Прымаем даведкі вызначанага ўзору, пры гэтым нас не цікавіць, у якім рэгіёне будучы курсант прайшоў медагляд. Галоўнае, каб тэрмін дзеяння даведкі адпавядаў нарматыўным дакументам. Прыём экзаменаў, выдача і абмен вадзіцельскіх пасведчанняў ажыццяўляецца рэгістрацыйна-экзаменацыйнымі падраздзяленнямі (далей — РЭП) па месцы жыхарства грамадзян альбо па месцы знаходжання ў выпадках, калі грамадзяне ў адпаведнасці з заканадаўствам абавязаны быць зарэгістраваны па месцы знаходжання. Дапускаецца прыём экзаменаў у РЭП па месцы знаходжання вучэбнай арганізацыі, у якой асоба прайшла навучанне. Асобе, якая паспяхова здала як тэарэтычны, так і практычны экзамен у РЭП па месцы знаходжання вучэбнай арганізацыі, у гэтым жа РЭП выдаецца вадзіцельскае пасведчанне».

Надзея ДРЫЛА.

Предложение о покупке акций

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»**
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	**220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Наименование и местонахождение эмитента	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Количество приобретаемых простых именных акций (штук)	**60 000**
Цена приобретения (белорусские рубли)	**20 000**
Сроки, форма и порядок расчета	**Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций в течение 30 календарных дней со дня заключения договоров купли-продажи акций**
Адрес, по которому направляются предложения акционеров на продажу акций и будут заключаться договоры купли-продажи акций	**220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	**с 16 марта 2009 года по 29 апреля 2009 года**
Даты начала и окончания покупки акций	**с 30 апреля 2009 года по 29 мая 2009 года**

УНП 100092167

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.31	18.08	11.37
Віцебск —	6.22	17.57	11.35
Магілёў —	6.22	17.58	11.36
Гомель —	6.17	17.55	11.38
Брэст —	6.47	18.23	11.36
Гродна —	6.46	18.24	11.38

Месяц

Поўня.

Месяц у сузор’і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Пракопа, Ціта.*

К. *Юстыны, Алоіза, Бярнарда, Васіля, Максіміляна, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР’Е на заўтра



Дзве даты

12 сакавіка



1954 год — 55 гадоў таму першыя атрады беларускай моладзі паехалі на асваенне цаліны.

1917 год — лютаўская рэвалюцыя ў Расіі. Усеагульная забастоўка перарасла ва ўзброенае паўстанне, пачаўся масавы пераход войскаў на бок паўстанцаў, якія занялі ключавыя пункты Санкт-Пецярбурга, урадавыя будынкі. Створаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а таксама Часовы камітэт Дзяржаўнай думы, які сфарміраваў Часовы Урад.

Цытата дня:

«Дзіўна, як гэта варажбіткі-прадказальніцы, зірнуўшы адна на адну, могуць яшчэ ўтрымлівацца ад смеху?».

Цыцэрон.

СТОЛ

Стол у культуры ўсходніх славян лічыўся прадметам асаблівага ўшанавання. Ён быў абавязкова высокі, стаяў у чырвоным куце і з’яўляўся неад’емнай часткай хаты, яе маркіраваным цэнтрам. Такая пашана да стала вынікала з таго, што ён быў непасрэдным удзельнікам шматлікіх рытуалаў і абрадаў. З надыходам хрысціянства стол пачалі параўноўваць з прастолам Боскім, а таму паводзіць сябе за сталом трэба было, як у царкве.

● Стол павінен быць абавязкова засланы абрусам. Пры гэтым уважліва сачылі за тым, якім бокам засланы абрус: левы бок абруса сімвалізаваў сабой «выключанасць» з паўсядзённага жыцця — жалобны стол.

● На стале не павінны знаходзіцца пабочныя рэчы, асабліва гэта датычылася нажа, грошай, ключоў, шапкі і торбы (сумы).

● Самым лепшым знакам дабрабыту і багацця ў хаце служыў хлеб на стале: «Хлеб на стол, так і стол — прастол, а хлеба ні лусты — дык і стол пусты».

● У кожнага члена сям’і было сваё месца за сталом, дакладна вызначанае яго сямейнымі, сацыяльнымі і ўзроставымі паказчыкамі. Гаспадар (галава сям’і) сядзеў на самым пачэсным месцы — у чырвоным куце, пад абразамі. Але ён сядзеў крыху ў аддаленні ад чырвонага кута, як бы пакідаючы месца для Бога. Калі ў сям’і не было бацькі, эстафету прымаў старэйшы жанаты сын. Калі сын не быў яшчэ жанатым, «верх» належаў маці. Аберуч ад гаспадара сядалі старэйшыя мужчыны, а за імі — малодшыя, потым жанчыны. Гаспадыня, тая, што гатавала ежу, часам зусім не садзілася за стол, а сілкавалася стоячы ці пасля таго, як паесць уся сям’я. Жанчына магла займаць самае пачэснае месца за сталом толькі ў выключным выпадку, калі яе абіралі хроснай маці на хрэсьбінах або на вяселлі свайго хрэсніка.

● Пільна сачылі за тым, каб ніхто не грукаў па стале. Лічылі, што стол — гэта «далонь Бога, працягнутая людзям». Казалі: «Не бі па стале, бо стол — Боская далонь».

● З-за стала выходзіць не спяшаліся. Славяне лічылі: «колькі прабудзеш за сталом, столькі і ў царстве нябесным будзеш».

● Калі выходзілі з-за стала, абавязкова дзякавалі Богу. Калі ўдзячнасць гучала ў бок гаспадароў, яны імкнуліся як мага хутчэй пераадрасаваць яе Нябёсам.

● Калі прыходзілі сваты, свацця абвязвала ножкі стала поясам, каб «вяселле завязалася». Перад тым, як выправіцца ў храм, жаніх і нявеста павінны былі тройчы абысці стол (а ў храме маладыя будуць тройчы абыходзіць прастол). За сталом дзялілі вясельны каравай. Вядомы такі звычай: нявеста, калі выходзіла з хаты, цягнула за сабой стол, каб сяброўка таксама хутка ўзяла шлюб.

● Перад доўгім і цяжкім шляхам чалавек імкнуўся атрымаць падтрымку ў сакральнага месца хаты — стала, для чаго тройчы цалаваў яго. Стол цалавалі і па вяртанні дадому.

● Паўсюдна вядома такая прыкмета: калі дзяўчына ў размове з хлопцам абапрэцца (прысядзе) на стол, яна ніколі не выйдзе замуж.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Глухі хірург наркоз не выкарыстоўвае.

☺

Зіма, холад. Сустракаюцца на вуліцы два мужыкі, адзін з іх, што з вялікім сабакам, кажа другому:

— Сагрэцца хочаш?

— Хачу.

— Азор, фас!

☺

Сцвярджаюць, што мужыкоў, маўляў, цікавіць толькі сэкс. Гэта не зусім так. Іх таксама і нават вельмі цікавяць пытанні ўлады, сусветнай перавагі, грошай і піва…



Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка». Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 7 (296)

Боб-меданос

Ці задумваліся вы, якая гародніна была найперш у рацыёне чалавека? Трэба думаць, што гэта былі прадстаўнікі сям’і бабовых. Іх знаходзяць пры раскопках разам з прадметамі, якія адносяцца да бронзавага веку. У Біблії сказана, што бабы вырошчвалі ў Палесціне ў час праўлення цара Саламона, за тысячу гадоў да нашай эры.

Трэба адзначыць, што разам з агуркамі, кавунамі і баклажанамі бабы вырошчваюць ужо больш як 4 тысячы гадоў. Для параўнання скажам, што «ўзрост» морквы, буракоў, часнаку, цыбулі, сельдэрэю складае два тысячагоддзі, а пятрушка, пастэрнак, гарбузы, дыня і інш. — яшчэ маладзейшыя.

Да ўвядзення ў культуру бульбы бабы былі адным з асноўных прадуктаў харчавання ў свеце. Не адзін раз яны ратавалі людзей ад голаду: сухое насенне, напрыклад, бобу нават у пакаёвых умовах захоўвання не страчвае сваёй усходжасці 4—5 гадоў, а свае харчовыя ўласцівасці захоўвае больш як дзесяць гадоў. Аднак у апошнія гады боб вырошчваецца мала і ён нават ператварыўся ў малараспаўсюджаную культуру. Цяпер часцей за ўсё ён сустракаецца ў пасадках бульбы, бо там, дзе расце боб знікае драцянік. Занатуйце сабе.

З усіх бабовых боб культура найбольш устойлівая да холаду. Насенне бобу можа прарасці пры тэмпературы 1 градус, але калі такая тэмпература будзе захоўвацца доўгі час, парасткі загніваюць. Аптымальная ж тэмпература прарастання 10—12 градусаў, маладыя ўсходы пераносяць кароткачасовыя замаразкі да мінус 5 градусаў. Высяваюць насенне, як толькі будзе гатова глеба (гэта трэцяя дэкада красавіка—пачатак мая), на глыбіню 5—6 см. Усходы з’яўляюцца на 10—12 дзень. Пасля іх з’яўлення глебу рыхляць, каб павялічыць доступ паветра да клубеньчыкавых бактэрый, якія жывуць на каранях, праполваюць і, калі трэба, паліваюць.

У насенні бобу многа раслінага бялку (23—35 працэнтаў), больш, чым у фасолі і зялёным гарошку, і ён добра засвойваецца арганізмам. Боб — адна з найлепшых дыетычных страў для хворых на печань, ныркі, кішэчнік. Для тых, хто ў час посту ўжывае вегетарыянскія стравы, гэта незаменная ежа, таму што боб па каларыйнасці перасягае бульбу і амаль не саступае мясу.

Боб высяваюць як ушчыльняемую культуру разам з бульбай, пры гэтым ураджай апошняй павышаецца на 15—20 працэнтаў. Гэта ахоўная расліна для агуркоў, памідораў і інш., яна засцерагае ад рэзкіх вятроў і іншых неспрыяльных умоў надвор’я. Боб вырошчваюць і на прыстовольных кругах маладых садоў, можна выдзеліць для яго градку, на якой расліны размясціць радамі: 40—45 см паміж радамі і 10—15 см паміж раслінамі.

Акрамя ўсяго іншага боб — добры меданос. Калі ў вас ёсць пчальнік, боб вам проста неабходны. Кажуць таксама, што краты абыходзяць бокам агарод, на якім расце боб. Збіраюць плады бобу праз 40—45 дзён з моманту прарастання насення, у фазе малочнай спеласці, калі яны не перавышаюць 1 см. Можна збіраць і ў фазе малочна-васковай спеласці. Спелае насенне выкарыстоўваюць як для наступнай сяўбы, так і ў ежу.

Памятайце:

● каб прадухіліць з’яўленне тлі, трэба прышчыкваць верхавінкі раслін на 10—12 см, адначасова гэта яшчэ садзейнічае больш ранняму выспяванню бобу;

● спелае насенне бобу трэба захоўваць у халадзільніку, каб не развівалася гарохавая зярноўка.

Бардоская вадкасць

«Як прыгатаваць бардоскую вадкасць?»

М. Лёўкіна, *г. Заслаўе.*

Каб атрымаць 10 л 1-працэнтнай бардоскай вадкасці, 100 г меднага купарвасу змяшчаюць у драўляную, гліняную або шкляную пасудзіну і растворваюць у невялікай колькасці гарачай вады. Затым даліваюць халодную ваду, даводзячы аб’ём раствору да 5 л.

У другой пасудзіне гасяць 100 г нягашанай вапны і разводзяць яе вадой, даводзячы аб’ём да 5 л, атрымліваецца вапнавае малако. Раствор меднага купарвасу ўліваюць ў вапнавае малако (але не наадварот) пры пастаянным памешванні драўлянай мяшалкай.

Поспех ураджаю — у насенні

Дасведчаныя агароднікі лічаць, што поспех залежыць ад насення. Таму для сяўбы адбіраюць добрае і якаснае насенне. Каб аддзяліць няякаснае насенне ад здаровага, паўнаважкага, змясціце яго ў 3—5-працэнтны раствор кухоннай солі (30—50 г на літр вады) на некалькі хвілін. Лёгкае, недабраякаснае ўсплыве, паўнаважкае асядзе. Пасля гэтага дастаньце з раствору насенне, прамыйце яго пад сцёкавай вадой, бо нават невялікая колькасць солі, якая застаецца на ім, зніжае ўсходжасць. Затым насенне прасушыце да сыпучасці.

Як вызначыць энергію прарастання і ўсходжасць? На дно талеркі пакладзіце два слоі вільготнай фільтравальнай паперы або марлі і на іх разлажыце насенне. Зверху накрыйце вільготнай паперай альбо марляй і змясціце ў цёплае месца (тэмпература 20—22 градусы), перыядычна ўвільгатняючы. Энергію прарастання насення капусты, кабачка, моркві, агурка, рэдзькі, радыскі, шчаўя, салаты, гароху, шпінату, рэвеню, гарбуза, рэпы, бручкі, баклажана дыні вызначаюць па колькасці насення, якое наклюнулася на 3—5 дзень, усходжасць — на 7—8 дзень. Энергію прарастання ў тамата, перца, сельдэрэя, пятрушкі, пастэрнаку, укропу вызначаюць на 7—9 дзень, а ўсходжасць на 10—14 дзень.

У час падрыхтоўкі насення да сяўбы вельмі важна яго аздараўць. Як лічаць вучоныя інстытута аховы раслін, знішчыць патагенную мікрафлору можна тэрмічным спосабам, праграваючы ў гарачай вадзе або з дапамогай прэпаратаў. Пры праграванні насенне капусты вытрымліваць 15—20 хвілін пры тэмпературы 48—50 градусаў, моркві — 15—20 хвілін пры тэмпературы 52—53 градусы, перцу, баклажана — 25 хвілін пры 50 градусах, шпінату — 20 хвілін пры 50 градусах, гароху — 5 хвілін пры 50 градусах. Абавязкова вытрымлівайце патрэбную тэмпературу, не перавышаючы яе. Пасля прагравання насенне астудзіце ў халоднай вадзе на працягу 2—3 хвілін, затым падсушыце. Насенне фасолі праграваўце гарачым паветрам на працягу 6—8 гадзін пры тэмпературы 50 градусаў.

Супраць вірусных захворванняў насенне, напрыклад, тамату дэзінфікуйце ў 1-працэнтным растворы марганцоўкі (10 г на 1 л вады) на працягу 20 хвілін. Карысна таксама замочваць насенне ў растворы попелу. 20 г попелу настойваюць на працягу 2 сутак у літры вады і змяшчаюць у яго насенне на 4—6 гадзін. Стойкасць да хваробаў у значнай ступені павышае апрацоўка насення мікраэлементамі перад сяўбой.

Любімая кветка Тургенева

Зусім нямнога часу застаецца да таго, як вашы кветнікі пачнуць ажываць — усіх магчымых колераў цюльпаны, гордыя нарцысы. Нарцыс жа, кветка, авеяная легендамі і паданнямі, займае выключнае месца ў творах многіх паэтаў і пісьменнікаў, саступаючы, магчыма, толькі ружам. Нарцысам захапляўся Шэкспір, Эдгар По, ён быў любімай кветкай Івана Тургенева. Прычына такой папулярнасці, відаць, у прыгажосці і вытанчанасці.

Паводле старажытнай легенды, прыгожы малады юнак Нарцыс не прыняў кахання німфы. Няшчасная ад безнадзейнасці звярнуць на сябе ўвагу высахла і ператварылася ў рэха, але перад смерцю сказала заклінанне: «Няхай не адкажа ўзаемнасцю Нарцысу той, каго ён пакахае». У адзін гарачы поўдзень Нарцыс схіліўся над ручайком, каб прагнаць смагу і ўбачыў там сваё адлюстраванне. Ніколі раней ён не сустракаў такой прыгажосці. Цяпер кожную раніцу юнак прыходзіў каб палюбавацца сваім адлюстраваннем. Нарцыс перастаў піць, есці, спаць і ўжо, як зачараваны, не адыходзіў ад таго ручая, на вачах марнеў. Усё закончылася б даволі сумна, калі б багі не злітаваліся над юнаком і не ператварылі яго ў прыгожую, белую духмяную, але халодную кветку.

У старажытных грэкаў гэта кветка лічылася кветкай памерлых, а старажытныя рымлянкі ўпрыгожвалі сябе вянкамі з нарцысаў, сустракаючы воінаў-пераможцаў, што вярнуліся з вайны. Нарцысы ў іх былі сімвалам мужнасці і доблесці. З даўніх часоў нарцысам цікавіліся кітайцы, у якіх ён абавязкова павінен быў прысутнічаць у кожным доме пад Новы год, а ў Швейцарыі кожны год у першую нядзелю мая наладжвалася свята ў гонар гэтай кветкі. Гірляндамі з нарцысаў упрыгожваліся ўваходы ў крамы, установы, а водар яго напаўняў вуліцы, дамы, кавярні. Ва Усходняй Прусіі нарцыс лічыўся сімвалам вясны і шчаслівага шлюбу. Дзяўчына, выйшаўшы замуж, забірала нарцыс з бацькоўскага дома і ў сваім новым жытле даглядала яго, каб ён як мага лепш развіваўся і рос, паводле падання, ад яго прыгажосці залежала шчасце маладых.

Нарцыс, такі прыгожы і авеяны легендамі, любяць і ў нас. Калі ж і як яго лепш садзіць? Лепш гэта рабіць у другой палове жніўня да канца верасня. Пры пасадцы ў гэтыя тэрміны цыбуліны добра ўкараняюцца, і расліны пачынаюць цвісці раней. Зрэшты, нарцысы можна высаджваць і ў больш познія тэрміны, але тады іх трэба абавязкова накрываць на зіму. Пры такой пасадцы цыбуліны засыпаюць крыху глыбей, а глебу мульчыруюць перагноем ці торфам таўшчынёй не менш як 3—5 см. Месца для нарцысаў трэба адводзіць адкрытае, сонечнае, але ахаванае ад ветру. Цыбуліны садзяць на адлегласці 15 см адна ад другой. Праз тры-чатыры гады адна цыбуліна ператвараецца ў невялікую клумбачку, якая ўжо складаецца з дзесяці і больш цыбулін. Чым буйнейшая цыбуліна, тым глыбей яе садзяць. Некаторыя кветкаводы дапускаюць, што нарцысы перасаджваць можна і вясной. У гэтых раслін утварэнне каранёў адбываецца амаль няспынна, за выключэннем перыяду, калі летам наземная частка засыхае. Карані пры гэтым не гінуць, і калі расліну не выкопваць, на цыбулінах будуць як аднагадовыя, так і двухгадовыя карані.

Арганічныя і мінеральныя ўгнаенні прымяняюць увосень пад асноўную апрацоўку глебы. Частку мінеральных угнаенняў (50—80 г суперфасфату, па 30—50 г аміячнай салетры і хлорыстага калію) лепш унесці ў выглядзе падкормкі вясной, у пачатку вегетацыі раслін.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым